№ 42 (592) 13 лістапада 2008 www.nn.by

# Наша Ніва

ПЕРШАЯ БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЭТА

ISSN 1819-1614

Заснаваная ў лістападзе1906. Адноўленая ў траўні 1991. Выдавец: Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы». Выходзіць штотыднёва, у чацьвяргі

### Крэдыт з хвіліны на хвіліну

Беларусь чакае рашэньня МВФ пра крэдыт на $2 млрд у найбліжэйшы час.

Старонка 2

### У Купалаўскім будзе новы дырэктар

Мікалай Кірычэнка сыходзіць. Яго месца можа заняць экс-дэпутатка палаты прадстаўнікоў.

Старонка 2

### Ластоўскаму — 125

Пішуць Анатоль Сідарэвіч, Андрэй Унучак, Язэп Янушкевіч, Ігар Кашчанка.

Старонка 12

## У НУМАРЫ

**Пудзіла маркі «Іскандэр»**

Зьвязваць плянавае пераўзбраеньне беларускага войска зь ідэяй «асымэтрычнага адказу» Масквы ЗША — вялікая нацяжка. Піша Аляксандар Класкоўскі. **Старонка 5.**

**КГБ асадзілі назад**

Гарадзенец Анджэй Пісальнік атрымаў афіцыйную паперу аб тым, што справа пра «экстрэмісцкі» нумар «Глосу з-над Немна» застанецца без разгляду. **Старонка 3.**

**Паўлічэнка пайшоў на павышэньне**

Пры канцы кастрычніка Дзьмітры Паўлічэнка быў прызначаны намесьнікам камандзіра корпусу аховы грамадзкага парадку унутраных войскаў МУС па баявой падрыхтоўцы. **Старонка 2.**

**Берасьце прыйдзе ў «крэпасьць-герой»**

Пасьля вываду вайскоўцаў на тэрыторыі Берасьцейскай крэпасьці вызвалілася 300 гектараў зямлі — унікальны археалягічны і прыродны комплекс. Аблвыканкам усур'ёз думае пра аднаўленьне там гістарычнага цэнтру. Што з гэтага можа выйсьці? Піша Сяргей Харэўскі. **Старонка 11.**

**Камуністы кветкі клалі**

Што падабаецца ў камуністах, дык гэта іх аптымізм. Штогод яны знаходзяць тэндэнцыі, якія сьведчаць, што перамога сацыялізму непазьбежная. 7 лістапада ў Менску. Рэпартаж Зьмітра Панкаўца. **Старонка 6.**

**Псыха-панка-гранджа-мэтал-хард**

Як выхаваць рок-зорку? Пра праект «Рок-школа» піша Павал Касьцюкевіч. **Старонка 7.**

**Дыскаграфія**

Дарафеева, Tanin Jazz, Разьбітае сэрца пацана, Макс Лорэнс. **Старонка 8.**

# Прывід дэвальвацыі

Расея наважылася на паўзучую дэвальвацыю нацыянальнай валюты. Беларускія эканамісты не выключаюць падобнага сцэнару і ў нашай краіне. **Старонка 4.**




Штучнае ўтрыманьне курсу рубля скарачае валютныя рэзэрвы краіны.

PHOTO.BYMEDIA.NET

## Крэдыты: браць ці ня браць

Шэраг беларускіх банкаў прыпыніў на няпэўны час выдачу крэдытаў, адначасова падвысіўшы стаўкі. Экспэрты папярэджваюць грамадзянаў пра рызыку банкруцтва і раяць зьвярнуцца да дэпазытаў.

Так, «Абсалютбанк» і «Сомбелбанк» практычна прыпынілі выдачу спажывецкіх крэдытаў. Пры гэтым заяўкі разглядаюцца, але тэрміны выдачы крэдытаў застаюцца нявызначанымі. «Белгазпрамбанк» не выдае пакуль крэдытаў на нерухомасьць і аўто, а «Белаграпрамбанк» часова спыніў выдачу валютных крэдытаў на жыльлё. «Белзьнешэканомбанк» не выдае валютных крэдытаў увогуле, «Беларусбанк» выдае валютныя крэдыты на спажывецкія мэты толькі на картках, «Трастбанк», наадварот, не выдае крэдыты ў далярах на картку.

Банкі «Масква—Менск» і «BelSwissBank» абмежавалі максымальныя сумы па крэдытах, што выдаюцца на картку. Максымальныя сумы валютных крэдытаў скараціліся больш чым у 7 разоў, крэдытаў у рублях — у 3—5 разоў.

Абмежаваў максымальныя сумы па крэдытах і «Прыёрбанк». Крэдыты на жыльлё і аўтакрэдытаваньне цяпер абмяжоўваюцца сумай у $35 тыс. Раней у залежнасьці ад крэдытнай праграмы крэдыты на жыльлё сягалі ад 30 да 150 тыс. даляраў.

У некаторых банках павялічыліся тэрміны разгляду і выдачы крэдытаў, як, напрыклад, у «БПБ-Банку» і «Белрасбанку».

У шэрагу банкаў стаўкі па валютных крэдытах практычна параўняліся з рублёвымі, а месцамі і перавысілі іх.

**Працяг на старонцы 4.**

КАМЭНТАР

## А іначай ты банкрут, Абама!

Піша Аляксандар Класкоўскі.

Лорд Бэл спраўна пастаўляе ў Менск карэспандэнтаў салідных выданняў «адтуль». Гэтым разам — з Wall Street Journal. Сам выбар сьведчыць, што Лукашэнку хацелася б замірыцца са Штатамі. Але так, каб нічым асабліва не ахвяраваць.

Афіцыйны лідэр выклаў свае пажаданьні ў фірмавай манэры. Завочна прачытаў бязвусаму кіраўніку ЗША маленькую лекцыю на тэму адзінства слова і справы: «Калі ён хоць у чым-небудзь адыдзе ад абяцаньняў, значыць, ён палітычны банкрут. Паабяцаў — выконвай. Калі сёньня нешта не атрымалася, то ідзі і тлумач, чаму гэта не атрымалася і калі ты гэта зробіш заўтра».

Момант для інтэрвію выбраны ўдала. У Абамы да беларускага пытаньня яшчэ ня хутка рукі дойдуць. А менскі калега ўжо выклаў умовы і такім чынам атрымаў псыхалягічны выйгрыш у вачох электарату. Цяпер, калі нармалізацыі ня выйдзе, можна будзе сказаць: не паслухаў гаспадар Белага дому разумных парадаў, не паціснуў працягнутай рукі!

Так, Абама прыйшоў на лёзунгах пераменаў, у тым ліку і ў замежнай палітыцы. Ён можа выявіць пэўную гнуткасьць у беларускім пытаньні. Аднак прарыву ў дачыненьнях з Вашынгтонам чакаць цяжка.

«Мы павінны вярнуцца да таго этапу, якасьці, якія былі да крызісу», — ставіць рамкавую ўмову Лукашэнка. Гэта можна разумець і так: спачатку скасуйце эканамічныя санкцыі супраць «Белнафтахіму», праз якія і разгарэлася дыпляматычная вайна. Амэрыцы ж важныя хоць сымбалічныя саступкі ў сакральных сфэрах дэмакратыі ды правоў чалавека. Штаты значна меней, чым Эўрасаюз, зьнітаваныя зь Беларусьсю эканамічна — адпаведна, меншыя і інтэнцыі да «прагматычнага дыялёгу».

Як зазначае палітоляг Андрэй Фёдараў, ступень саступак патрабаваньням ЗША залежыць ад таго, наколькі моцна закране Беларусь крызіс.

Паколькі прэм’ер Сідорскі кажа пра яго сымптомы насуперак устаноўцы прэзыдэнта, што крызісу ў нас, маўляў, няма і ня будзе, — то справа, мусіць, сур’ёзная. Расея ўжо маральна рыхтуецца да дэвальвацыі свайго рубля. Тут нам і гукнецца «братняя інтэграцыя».

Карацей, паслухае Абама ці не, а трыадзіная пяраўская задача-мінімум выкананая. Мэсыдж Вашынгтону, рэвэранс у бок Масквы і ўражаньне на ўласны электарат: во як «бацька» ізнага маладога прэзыдэнта розуму навучае!

# У Купалаўскім будзе новы дырэктар

Паводле неафіцыйнай інфармацыі, экс-дэпутатка палаты прадстаўнікоў Натальля Аўдзеева можа стаць дырэктаркай Купалаўскага тэатру, зьмяніўшы Мікалая Кірычэнку.



Натальля Аўдзеева два тэрміны была дэпутатам палаты прадстаўнікоў.

АНДРЭЙ ЛЯНКЕВІЧ

Афіцыйных загадаў аб звальненьні дырэктара і прызначэньні новага пакуль няма. Але Мікалай Кірычэнка ў гутарцы з карэспандэнтам «НН» не хаваў, што сыходзіць у адстаўку: «Я даўно гэтага хацеў, бо адчуваў, што не магу спалучаць працу дырэктара і дзейнага актора тэатру. І гэта было вядома ўсім задоўга да кастрычніцкага крызысу. Канечне, я бяру частку віны за творчы крызіс на сябе, але крызіс, які напаткаў тэатар, — творчы, а не адміністратыўны, а пасада гэндырэктара адміністратыўная».

Нагадаем, у кастрычніку ў тэатры шугануў скандал. Нагодай стаў сход, які адбыўся пасьля зрыву аднаго са спэктакляў актора Алегам Гарбузам. Гутарка на сходзе перайшла на агульны стан рэчаў: акторы абвінавацілі кіраўніцтва ў застоі, зашмат спэктакляў, замала якасьці. Пасада мастацкага кіраўніку тэатру была прапанаваная рэжысёру Мікалаю Пінігіну, але ягоныя ўмовы былі непрымальная для дырэкцыі.

Аляксей Стрэльнікаў, тэатральны крытык, кажа, што генэральны дырэктар фармальна ня мае права ўмешвацца ў творчы працэс, напрыклад выбіраць п’есы, але пасада ўсё адно ўплывовая. Гендырэктар здольны ўзьдзейнічаць на рашэньні мастацкага кіраўніка апасродкавана.

Сама Натальля Аўдзеева пакуль ад камэнтароў адмаўляецца. Магчымая новая кіраўнічка Купалаўскага тэатру, нарадзілася ў 1957 г. у Магілёве, скончыла Магілёўскі пэдінстытут і Беларускі ўнівэрсытэт культуры. Паводле адукацыі Н.Аўдзеева настаўніца расейскай мовы і літаратуры, культпрасьветработнік і рэжысёр сьвятаў. Яна працавала сакратаром Цэнтральнага райкаму ЛКСМБ Магілёва, інструктарам аддзелу прапаганды і агітацыі райкаму КПБ, загадчыцай аддзелам культуры гарвыканкаму, мастацкай кіраўнічкай-дырэктаркай абласнога тэатру лялек, намесьніцай старшыні Магілёўскага гарвыканкаму. Яна два тэрміны была дэпутаткай палаты прадстаўнікоў, і двойчы прызначалася намесьніцай старшыні камісіі па адукацыі, культуры, навуцы і навукова-тэхнічным прагрэсе. Па выніках верасьнёўскіх выбараў ня трапіла у палату.

**Павал Касьцюкевіч, з выкарыстаньнем матэрыялу з belmy.info**

НАВІНЫ СЕРАДЫ

### Курапацкім вандалам пагражае ад трох гадоў да дванаццаці

Бараўлянскі аддзел Менскага РУУС пачаў крымінальную справу адносна двух маладзёнаў, затрыманых у Курапацкім лесе 1 лістапада. Яны падазраюцца ў зьнішчэньні крыжоў. Справа распачатая паводле артыкулу 344 (наўмыснае пашкоджаньне гісторыка-культурных каштоўнасьцяў). Паводле гэтага артыкулу прадугледжана пакараньне пазбаўленьня волі ад трох да дванаццаці гадоў.

### Ярмошыну — у Эўропу

Герт Арэнс, кіраўнік назіральнікаў АБСЭ на парлямэнцкіх выбарах у Беларусі, заявіў, што старшыня Цэнтральнай выбарчай камісіі Лідзія Ярмошына павінна быць выключаная зь сьпісу невыязных у Эўрасаюз асобаў. Паводле Арэнса, няправільна пакідаць Ярмошыну ў гэтым сьпісе, калі Лукашэнка, чые інструкцыі яна выконвае, выключаны зь яго.

### На сайце «Белсату» зьявіўся архіў

Незалежны тэлеканал «Белсат» разьмясьціў на сваім сайце архіў тэлепраграмаў, многія зь якіх пры адсутнасьці сёньня ў краіне свабоды слова зьяўляюцца ўнікальнымі. Зараз на сайце www.belsat.eu можна прагледзець архівы навіновай праграмы «Аб’ектыў», а таксама ўсіх тэлепраграмаў, якія выпускаюцца каналам, уключаючы грамадзка-палітычнае ток-шоў «Форум» і праграму «Госьць на «Белсаце».

### Euronews здымае рэклямны ролік пра Беларусь

«Наведай найстарэйшы запаведны лес Эўропы» — рэклямны ролік з такім слоганам здымае для Беларусі тэлеканал Euronews. Чакаецца, што сюжэт будзе трансьлявацца на тэлеканале зь лютага.

**АГ; «Мы», радыё «Свабода»**

## Крэдыт з хвіліны на хвіліну

Беларусь чакае рашэньня Міжнароднага валютнага фонду наконт выдзяленьня крэдыту на $2 млрд. у найбліжэйшы час.

Пра гэта 12 лістапада на прэс-канфэрэнцыі па выніках паседжаньня кіраўнікоў урадаў Беларусі і Латвіі паведаміў прэм’ер-міністар Сяргей Сідорскі.

«На мінулым тыдні мы накіравалі пакет дакумэнтаў у МВФ. Экспэрты гэтай арганізацыі паставіліся зычліва да нашай прапановы. Мы чакаем іх рашэньня ў найбліжэйшы час», — сказаў прэм’ер.

Сяргей Сідорскі нагадаў, што Беларусь зьвярнулася ў МВФ наконт выдзяленьня крэдыту на суму $2 млрд. для гарантаваньня «падушкі бясьпекі» для беларускай эканомікі, якая застаецца адкрытай. Сусьветны фінансавы крызыс адбіваецца на працы фінансавай сыстэмы ў Эўрасаюзе, краінах Балтыі ды іншых, зь якімі гандлюе наша краіна.

«Безумоўна, для нашых экспартных паставак важна забясьпечваць праплаты. На жаль, шраг кампаній, якія працуюць зь беларускімі экспарцёрамі, даюць растэрміноўку плацяжоў да 180 дзён, а гэта значна вымывае абаротныя сродкі прадпрыемствы», — дадаў ён.

Кіраўнік ураду таксама паведаміў, што цяпер Беларусь не адчувае сур’ёзнага ўплыву сусьветнага фінансавага крызысу, аднак «падушка бясьпекі для нас была б своечасова».

Тым часам МВФ адклаў рашэньне аб прадастаўленьні крэдыту ў 2 млрд даляраў Ісьляндыі. Апынуўшыся на мяжы банкруцтва ў выніку сусьветнага фінансавага крызысу, краіна дамовілася пра атрыманьне крэдыту яшчэ 24 кастрычніка, але рада дырэктараў МВФ так і не ўхваліла яго выдачу.

## Паўлічэнка пайшоў на павышэньне

Пры канцы кастрычніка Дзьмітры Паўлічэнка быў прызначаны на пасаду намесьніка камандзіра корпусу аховы грамадзкага парадку ўнутраных войскаў МУС па баявой падрыхтоўцы.

Загад пра прызначэньне падпісаў міністар унутраных справаў Уладзімер Навумаў. Новая пасада фармальна зьяўляецца больш высокай, чым камандзір брыгады.

Як паведамілі ў МУС, літаральна днямі ў брыгадзе, якой раней камандаваў палкоўнік Паўлічэнка, той паводле традыцыі «разьвітаўся з баявым сьцягам і асабовым складам брыгады».

## Кандаліза Райс — самая глямурная жанчына году

Дзяржаўны сакратар ЗША Кандаліза Райс, аўстралійская акторка Ніколь Кідман і емэнская дзяўчынка Нуджуд Алі, якая парушыла законы племені, каб атрымаць развод, названыя часопісам Glamour «самымі глямурнымі жанчынамі году».

Кандаліза Райс «паставіла жаночае пытаньне на пярэдні плян амэрыканскай жаночай палітыкі», —напісаў часопіс, прысьвечаны модзе і жыцьцю знакамітасьцяў.

Часопіс таксама прысудзіў сваю прэмію ў сфэры правоў чалавека адвакату Шадэ Насэр ды яе падапечнай Нуджуд Алі. Заручаная ў 10 гадоў, Алі з дапамогай Насэр пачала судовы працэс, на якім пазоўнікі дамагліся гістарычнага для Емэну разводу. «Алі ды Насэр сваёй рашучасьцю выратавалі іншых маленькіх дзяўчынак ад раньніх шлюбаў», — піша Glamour.

**АГ, БЕЛТА, «Народная воля»**

# КГБ асадзілі назад

Як піша ў сваім блогу гарадзенскі журналіст Анджэй Пачобут, гарадзенец Анджэй Пісальнік днямі атрымаў афіцыйную паперу з суду Кастрычніцкага раёну Горадні пра тое, што справа пра «экстрэмісцкі» нумар «Глосу з-над Немна» застанецца без разгляду.

З усіх магчымасьцяў спыненьня гэтай скандальнай справы — занадта вялікі рэзананс, які пры сёньняшнім раскладзе не патрэбны — улады выбралі найпрасьцейшы. Маўляў, няправільна напісаная позва.

Генерал-маёру і начальніку УКДБ па Гарадзенскай вобласьці Ігару Пятровічу Сяргеенку плюнулі ў твар, кпіць аўтар poczobut.livejournal.com.

Адначасова з «Глосам» мусілі прызнаць экстрэмізмам і масу іншых выданьняў, у тым ліку перадвыбарныя, 2006 году, улёткі Мілінкевіча, кнігу Севярынца... Аднак гэбоўцаў «асадзілі назад». Нават рашэньне Івейскага раённага суду, што па першым пазове з ГБ прызнаў экстрэмізмам абсалютна звычайны нумар газэты «Свабода», гарадзенскі абласны суд скасаваў і вярнуў на пераразгляд. Лібэралізацыя ідзе!.. І «абаронцы дзяржаўнага ладу», і «судзьдзі» яшчэ раз паказалі, што іхны закон як дышла.

**МБ**

# Мілінкевіч і Шушкевіч на балі прэзыдэнтаў



УЛАДЗЬ ГРЫДЗІН

Лідэр «Руху «За свабоду» Аляксандар Мілінкевіч, а таксама старшыня БСДГ Станіслаў Шушкевіч узялі ўдзел ва ўрачыстым сьвяткаваньні 90-годзьдзя незалежнасьці Польшчы.

На баль, арганізаваны прэзыдэнтам Польшчы Лехам Качыньскім, былі запрошаныя прэзыдэнты і кіраўнікі ўрадаў 55 краінаў (зрэшты, далёка ня ўсе адказалі згодай), агульная колькасьць гасьцей склала паўтары тысячы чалавек.

Удзел ва ўрачыстасьцях узялі прэзыдэнты Літвы, Латвіі, Эстоніі, Вугоршчыны, Грузіі і Харватыі. У Варшаву таксама прыехалі канцлерка Германіі і прэм'ер-міністар Чэхіі.

Быў заўважаны на сьвяткаваньні і пасол Беларусі Павал Латушка, місія якога ў Польшчы падыходзіць да завяршэньня. Аляксандра Лукашэнку на сьвяткаваньне ў польскую сталіцу ніхто не запрашаў.

**ЗП**

# Мітрапаліт Кандрусевіч асьцярожна раскрытыкаваў улады

10 лістапада — першая гадавіна кананічнага ўступленьня на пасаду мітрапаліта Менска-Магілёўскага арцыбіскупа Тадэвуша Кандрусевіча. З гэтай нагоды была скліканая прэс-канфэрэнцыя, дзе сьвятар падзяліўся дасягненьнямі і няўдачамі беларускага Каталіцкага Касьцёлу за гэты час, а таксама крыху расказаў пра далейшыя пляны.

Ці не ўпершыню з моманту ўступленьня на пасаду мітрапаліта Тадэвуш Кандрусевіч асьцярожна раскрытыкаваў дзеяньні ўладаў. «Касьцёл сёньня ў цяжкой сытуацыі. У Менска-Магілёўскай дыяцэзіі мы маем 110 парафій, але толькі каля 90 касьцельных будынкаў. Нялёгка атрымаць дазвол на рэгістрацыю, дазвол на будаўніцтва храму. Часамі адказы абсалютна незразумелыя. Кажуць, што ў парафіі мала вернікаў», — гаворыць Т.Кандрусевіч.

Мітрапаліт зьвяртае ўвагу на складанасьць з колькасьцю сьвятароў. На сёньня ў дыяцэзіі прыкладна сто ксяндзоў. Дзьве траціны зьяўляюцца грамадзянамі Беларусі, траціна — замежнікі. На думку Кандрусевіча, гэта вельмі мала, каб весьці паўнавартасную душпастарскую дзейнасьць. Некалькі крытычных словаў было сказана наконт таго, што ў краіну не дазваляюць надалей прыяжджаць сьвятарам з-за мяжы.

«На працягу 70 гадоў мы былі пазбаўленыя ўласнай духоўнай сэмінарыі. Нам кажуць, каб набіралі болей у тыя сэмінарыі, што маем сёньня. Мы прымем усіх, хто прыйдзе і хто гатовы стаць сьвятаром. У сёньняшніх сусьветных працэсах вельмі цяжка абыйсьціся выключна сваімі сіламі. Паглядзіце, хто трэніруе зборныя Беларусі па футболе і хакеі, — замежнікі. Мне здаецца, што тут добрым прыкладам магла быць Афрыка, дзе раней амаль усе сьвятары і біскупы былі белыя, а цяпер на іх месца прыйшлі мясцовыя. Гэта ўсё затрымлівае духоўнае адраджэньне. Гэта важна ва ўмовах разьвіцьця сэктаў, у прыродзе ня можа быць вакууму і нашае месца зоймуць іншыя», — кажа арцыбіскуп.

Тадэвуш Кандрусевіч адзначыў, што ў сёньняшнім сьвеце мала хто ведае пра Каталіцкі Касьцёл у Беларусі. З мэтай пашырэньня ведаў пра каталіцкае жыцьцё ў нашай краіне кіраўнік Менска-Магілёўскай дыяцэзіі цягам году наведваў мноства міжнародных канфэрэнцыяў і сэмінараў. На наступным тыдні арцыбіскуп накіруецца ў Лос-Анджэлес.

Са станоўчых тэндэнцыяў была адзначаная праца выдавецтва «Pro Christo», якое цягам году выпусьціла 26 выданьняў — рэлігійных, малітоўнікаў, навуковых, мастацкіх. Тадэвуш Кандрусевіч хацеў бы, каб у Касьцёла зьявілася нейкае пэрыядычнае выданьне, якое б выходзіла хаця б раз на два тыдні, а найлепей — штотыдзень.

На сёньня вядзецца пераклад на беларускую мову дакумэнтаў Другога Ватыканскага Сабору, паводле якога і жыве Касьцёл. Кандрусевіч кажа, што гэта адна зь першасных задач.

Былі высока ацэненыя арганізацыя сакавіцкага тэлемосту паміж Менскам і Ватыканам, а таксама каталіцкія дні моладзі, што прайшлі летам у Івянцы, паралельна з сусьветнымі, што адбываліся ў далёкім Сыднэі.

Кандрусевіч кажа, што Каталіцкі Касьцёл стараецца весьці дыялёг з прадстаўнікамі іншых канфэсіяў — праваслаўнымі, юдэямі, мусульманамі. Для гэтага таксама было праведзена шэраг сумесных мерапрыемстваў.

Найбольш значнай падзеяй году мітрапаліт назваў візыт у Беларусь кардынала Бэртонэ. Менавіта тады Лукашэнка перадаў запрашэньне ў Беларусь Бэнэдыкту XVI. Кандрусевіч кажа, што сустракаўся з папам 29 чэрвеня і тады ён сказаў, што наведае Беларусь, калі «Бог дазволіць».

Няма пакуль ніякай яснасьці і адносна таго, калі будзе заключаны канкардат паміж афіцыйным Менскам і Ватыканам. Кандрусевіч наконт гэтага пытаньня параіў лепш зьвярнуцца да нунцыя.

Сярод плянаў на будучыню арцыбіскуп адзначыў, што будзе зьдзяйсьняць кананічныя візытацыі ў парафіі сваёй дыяцэзіі. Падчас такіх візытаў, якія робіцца раз на пяць гадоў, кожны пробашч мусіць даць справаздачу адносна дзейнасьці сваёй парафіі. Таксама кожны біскуп мусіць зрабіць падобную справаздачу папу Рымскаму. Кандрусевіч кажа, што такое можа адбыцца ў канцы 2009 году.

**Зьміцер Панкавец**

## СЬЦІСЛА

### Дзяды ў Лошыцы

Некалькі дзясяткаў чалавек узялі ўдзел у санкцыянаваным шэсьці ў Менску ад Палацу культуры камвольнага камбінату да Лошыцкага яру, дзе ў 30-я гады мінулага стагодзьдзя праводзіліся масавыя расстрэлы нявінных людзей. Раней у Лошыцкім яры пабывалі сябры Партыі БНФ.

### Зэльцэр будзе сядзець у Магілёве

Амэрыканскі грамадзянін Эмануіл Зэльцэр будзе адбываць пакараньне ў магілёўскай калёніі агульнага рэжыму, а ягоную сакратарку Ўладлену Функ адправяць у жаночую калёнію ў Гомелі.

### Суд пад Каляды

Крымінальную справу супраць моладзевага актывіста Аляксандра Баразенкі, апошняга фігуранта ў «справе 14-ці», перадалі ў суд. Аляксандар ад 27 кастрычніка знаходзіцца ў менскім сьледчым ізалятары. Судзіць Аляксандра Баразенку будзе судзьдзя Цэнтральнага суду Менску Валеры Есьман.

### Новы кіраўнік ДАІ

Абавязкі начальніка ўпраўленьня Дзяржаўтаінспэкцыі МУС Беларусі выконвае Васіль Бульбянкоў, які раней узначальваў менскую ДАІ. Аляксандар Мендзелеў, які ўзначальваў гэтую службу з пачатку 2006 года, адхілены ад займанай пасады. Гэта магло адбыцца паўтара месяцы таму, аднак стала вядома толькі цяпер. «Арганізацыя асьветы на ўсіх узроўнях — задача, зь якой ня справілася ранейшае кіраўніцтва ДАІ, за што яе начальнік і быў адхілены ад пасады», — сказаў У.Навумаў.

### «Борисовские новости» атрымалі папярэджаньне

Недзяржаўная рэгіянальная газэта «Борисовские новости» 11 лістапада атрымала папярэджаньне ад Міністэрства інфармацыі. Падставай для санкцыі стаў артыкул «Бал сатаны, или третье пришествие Гуминского» (нумар «БН» ад 02.10.2008 г.). У публікацыі, прысьвечанай вынікам парлямэнцкіх выбараў у Барысаўскай выбарчай акрузе № 62, расказвалася пра верагодныя парушэньні на выбарчых участках.

### У Партыі БНФ ужо 10 кандыдатаў на пасаду прэзыдэнта

На сёньня ў ліку прэтэндэнтаў значацца: Сяргей Антусевіч (Горадня), Ігар Лялькоў (Менск), Аляксандар Мех (Кобрынь), Іван Шэга (Слонім), Сяргей Мальчык (Горадня), Рыгор Кастусёў (Магілёў), Зміцер Салаўёў (Магілёў). Сярод кандыдатаў ёсьць таксама адна жанчына — гэта паэтка Лера Сом (Полацак). У сьпіс увайшоў і старшыня партыі Лявон Баршчэўскі, а таксама ягоны першы намесьнік Вінцук Вячорка.

**СП, МБ, ЗП; БелаПАН, gazetaby.com**

# Прывід дэвальвацыі

Расея наважылася на паўзучую дэвальвацыю нацыянальнай валюты. Беларускія эканамісты не выключаюць падобнага сцэнару і ў нашай краіне.

У мінулы чацьвер ад аднаго з сталічных банкаў зьявілася інфармацыя пра намер Нацбанку разава абясцэніць беларускі рубель. У прэсавай службе Нацбанку гэтыя чуткі не пацьвердзілі: «Ніякага абвалу ня будзе. Сытуацыя не выходзіць за рамкі прагнозавых паказчыкаў. Дэвальвацыя рубля ў нязначных памерах адбываецца штодня, але пра сур'ёзны памер гаворка не вядзецца». У той самы дзень стала вядома, што Нацбанк абмежаваў аб'ёмы куплі банкамі валюты на Беларускай валютна-фондавай біржы, а таксама пачаў зьбіраць інфармацыю пра мэты набыцьця валюты банкамі для рэзыдэнтаў краіны на пазабіржавым рынку.

11 лістапада расейскія СМІ распаўсюдзілі інфармацыю пра тое, што Цэнтрабанк Расеі не выключае аслабленьня рубля, бо падтрымка нацыянальнай валюты скарачае валютныя рэзэрвы краіны. Толькі ў мінулым месяцы на гэтыя мэты было выдаткавана $72,2 млрд.

Свае валюты ўжо дэвальвавалі на 20% Украіна, Ісьляндыя, Вугоршчына — краіны, як аказалася, з самымі хісткімі фінансавымі сыстэмамі. Па ўкраінскай эканоміцы ўдарыла падзеньне попыту на мэтал — асноўны артыкул украінскага экспарту. Ісьляндзкую крону паваліў банкаўскі крах, а вугорцы папросту даўно жылі не па сродках. У той жа час пакуль стабільна трымаюцца Польшча, Літва, Латвія.

Эканаміст Аляксандар Чубрык мяркуе, што пытаньне дэвальвацыі нацыянальнай валюты, зь якім сутыкнулася Расея, актуальнае і для Беларусі. На ягоную думку, дэвальвацыі не пазьбегнуць у выпадку, калі Беларусь не атрымае $2 млрд крэдыту ад МВФ альбо іншага крэдыту. У такім разе нашу краіну чакае банкаўскі крызіс. І тут толькі ад дзеяньняў Нацбанку залежыць, як будзе разьвівацца сытуацыя. У тым ліку гэта датычыць і межаў аслабленьня рубля. Пакуль жа, кажа эканаміст, дакладных прагнозаў чакаць ня варта.

**Сямён Печанко**

# Крэдыты: браць ці ня браць

**Працяг са старонкі 1.**

Што ў такой сытуацыі раяць эканамісты? Аглядальнік газэты «Белорусы и рынок» Уладзімер Тарасаў перасьцерагае ад спробаў атрымаць крэдыт у сёньняшніх варунках.

Найперш усё больш актуальнай робіцца пагроза страты крэдытаатрымальнікам працы або зьніжэньня заробкаў, што зробіць немагчымым выплату па крэдыце. Па-другое, існуе пагроза страты сродкаў з-за зьніжэньня цаны залогу. У такім выпадку банк, які выдаў крэдыт, можа запатрабаваць дадатковых гарантыяў або павялічыць памер выплатаў. У выпадку, калі ад крэдыта адмовіцца немагчыма, эканаміст раіць браць яго ў той валюце, у якой чалавек атрымлівае прыбыткі.

Калі з крэдытамі спэцыялісты раяць пачакаць, то для дэпазытаў, кажуць яны, — самы час. Тут паўстае пытаньне выбару валюты. У.Тарасаў нагадвае пра стандартны ў такіх выпадках варыянт — фармаваньне партфэлю дэпазытаў з розных валютаў. На набыцьцё нерухомасьці варта адкладаць у далярах, бо цэны на кватэры ў Беларусі указваюцца менавіта ў іх.

**Паводле infobank.by і «Белорусы и рынок»**




PHOTO.BYMEDIA.NET

**У Менску большае рэкламы банкаў аб прыёме ўкладаў ад насельніцтва.**

## Чарговае падвышэньне стаўкі рэфінансаваньня

З 12 лістапада стаўка рэфінансаваньня вырасла на 0,25 працэнтнага пункту, да 11% гадавых. Робіцца гэта «дзеля павышэньня даходнасьці ашчаджэньняў у нацыянальнай валюце і далейшага ўмацаваньня фінансавай стабільнасьці», заявілі ў Нацбанку. Гіпатэтычна ад гэтага выйграюць уласьнікі дэпазытаў, прывязаных да стаўкі рэфінансаваньня. Прайграюць жа атрымальнікі прывязаных да гэтай стаўкі крэдытаў.

Банкі, устанаўліваючы сваю стаўку, арыентуюцца на стаўку рэфінансаваньня і дадаюць свае працэнты. У нашым выпадку, на тле сусьветнага крызісу, гэта заваблачныя ад 6% да 15%.

Апошні раз Нацбанк павышаў стаўку рэфінансаваньня на 0,25 працэнтнага пункту менш чым месяц назад. 15 кастрычніка стаўка рэфінансаваньня была падвышаная да 10,75% гадавых.

Тым часам уліковая стаўка ў ЗША была, наадварот, зьніжаная да 1%. Банк Англіі рэзка скараціў уліковую стаўку з 4,5% да 3% — спрабуючы тым самым стымуляваць рост эканомікі. Гэта самая нізкая базавая працэнтная стаўка ў Брытаніі з 1955 г. Праўда, брытанскія банкі адмаўляюцца паніжаць працэнты. Цэнтральны эўрапейскі банк таксама панізіў сваю стаўку — з 3,75% да 3,25%.

**АГ**

## СЬЦІСЛА

### «Газпром»: Страты кампэнсуем за кошт Беларусі ды Украіны

«Газпром» скараціў пастаўкі газу ў Эўропу на 8,3% у параўнаньні з аналягічным пэрыядам мінулага году. Аб'ём закупак скарацілі найперш асноўныя пакупнікі — Нямеччына, Італія ды Турцыя. Іх не задаволіла падвышэньне цэнаў з 1 кастрычніка да $460—520 за тысячу кубамэтраў. Асноўныя страты манаполія прагназуе ў наступным годзе і зьвязвае іх з зьніжэньнем цэнаў да $360—400 для спажыўцоў у Заходняй Эўропе. Недаатрыманы прыбытак манаполія разьлічвае кампэнсаваць за кошт продажу 22 млрд кубоў газу Беларусі і 55 млрд Украіне па $200 і $250-400 за тысячу кубамэтраў адпаведна.

### Horizon Capital рыхтуецца інвэставаць у беларускую эканоміку

Інвэсткампанія Horizon Capital сфармавала новы фонд у $390 млн для наўпроставых інвэстыцыяў у кампаніі Беларусі, Украіны і Малдовы — Emerging Europe Growth Fund II, LP (EEGF II). Найбольш пэрспэктыўнымі лічацца вытворцы прамысловых і спажывецкіх тавараў і паслугаў, а таксама фінансавыя ўстановы. Варта адзначыць, што фонду EEGF належаць 33,6% акцыяў Менскага транзытнага банку (МТБ).

### Лукашэнка падпісаў указ пра прыватызацыю некаторых УП

Указ № 605 «Пра некаторыя пытаньні прыватызацыі рэспубліканскіх унітарных прадпрыемстваў» вызначыў пералік РУП, пры пераўтварэньні якіх у адкрытыя акцыянэрныя таварыствы належныя дзяржаве акцыі ня будуць падлягаць продажу на льготных умовах і абмену на іменныя прыватызацыйныя чэкі «Маёмасьць». У сьпіс трапілі найбольш эканамічна значныя для краіны прадпрыемствы Мінпрамысловасьці, Мінэнэргетыкі, ВПК, Беларускага дзяржаўнага канцэрну па нафце і хіміі, якія знаходзяцца ў рэспубліканскай уласнасьці, уключаныя ў плян прыватызацыі на 2008—2010 г.

### Кіраўнік «Растэхналёгіі» ў Менску

Беларусь мае намеры захоўваць устойлівыя кааперацыйныя сувязі буйных беларускіх заводаў і навукова-вытворчых аб'яднаньняў з прадпрыемствамі «Растэхналёгіі», зазначыў Лукашэнка ў часе сустрэчы з кіраўніком найбуйнейшай расейскай карпарацыі Сяргеем Чэмезавым. «Для нас, напрыклад, вельмі цікавы МАЗ, Менскі завод колавых цягачоў, — сказаў у сваю чаргу Чэмезаў. — Хацелася б ствараць сумесную вытворчасьці, але не для таго, каб канкураваць паміж сабою на агульным рынку, а разьмяркоўваць яго, каб мы маглі канкураваць з эўрапейскімі, амэрыканскімі, кітайскімі кампаніямі».

Карпарацыя «Растэхналёгіі» аб'ядноўвае 400 прадпрыемстваў — ад мэталюргіі, цяжкага машынабудаваньня, хіміі да авія- і прыборабудаваньня.

### Бэнзін не патаньнее

І гэта нягледзячы на тое, што нафта за апошнія месяцы патаньнела амаль удвая. Паводле інфармацыі агенцтва ПРАЙМ-ТАСС, такая магчымасьць разглядалася ўрадам, але была адхіленая. Бо гэта нібыта непазьбежна прывяло б да перагляду памеру дзяржаўных субсыдыяў для нафтаперапрацоўчых кампаніяў. У Літве за апошнія месяцы бэнзін АІ-95 патаньнеў у паўтара разу і каштуе каля 90 эўрацэнтаў. Для параўнаньня: у Беларусі гэтулькі каштуе літар 92-га бэнзіну. Нязначна, але патаньнеў бэнзін у Расеі.

### Латвійскі ўрад нацыяналізаваў Parex Banka

Кантрольны пакет (51%) другога па велічыні латыскага банку абышоўся дзяржаве 3,56 эўра. Пры гэтым ураду даводзілася выбіраць — або дапусьціць банкруцтва банку, або падтрымаць фінансавую сыстэму. Банкруцтва абышлося б падаткаплатнікам прыкладна ў мільярд даляраў. «Парэкс» зьяўляецца найбуйнейшым балтыйскім банкам, які не належыць заходняму ўладальніку. Ён мае свае філіі і прадстаўніцтвы ў пятнаццаці краінах сьвету — ад Узбэкістану да Брытаніі. Першае сваё замежнае прадстаўніцтва Парэкс адчыніў у Беларусі ў 1993 г. Акрамя таго ў Менску дзейнічае лізінгавая кампанія банку.

У апошнія гады банк разгортваў сваю дзейнасьць на Захадзе, прываблiваючы людзей высокімі адсоткамі па ўкладах. Актывы банка складаюць 4,3 мільярды эўра.

### Польшчу чакае пераразьмеркаваньне інвэстыцыяў

Як прагназуе Польскае агенцтва інфармацыі і замежных інвэстыцыяў, замежныя канцэрны перастануць будаваць у Польшчы новыя фабрыкі. Інвэстары ўсё ахвотней паглядаюць на рынак паслугаў. Гэтаму спрыяе найперш агульны спад эканомікі. На разьвіцьцё сэктару паслугаў уплывае таксама зьмена польскай гаспадаркі, якая ўсё часцей аддае перавагу гэтаму рынку.

**СП, СБ; паводле «КоммерсантЪ», БЕЛТА, БелаПАН, Салідарнасьць, Rzeczpospolita**

# Агароднае пудзіла маркі «Іскандэр»

Піша Аляксандар Класкоўскі.

Гэтыя «Іскандэры» сталі ўжо нейкім унівэрсальным пудзілам. Вось і цяпер пасьля заяваў дырэктара па асаблівых даручэньнях расейскага «Расабаронэкспарту» Мікалая Дземідзюка ўэб-рэсурсы застракацелі панічнымі загалоўкамі, што тыя «Іскандэры» могуць зьявіцца і ў Беларусі.

Дык ня могуць, а зьявяцца абавязкова! Калі толькі беларускае кіраўніцтва не рассабачыцца з Масквой ушчэнт. Рэч у тым, што адпаведнае пераўзбраеньне нашай 465-й ракетнай брыгады пад Асіповічамі даўно запланаванае. Арыенціровачны тэрмін: 2015—2020 гады.

Але — увага! — гэта будуць ужо беларускія «Іскандэры», купленыя ў расейцаў. Пад беларускім камандаваньнем.

Прычым экспартная мадыфікацыя б'е толькі на 280 км. Да радара ў Чэхіі зь іх не дастрэліш (ды і да польскіх шахтаў з супрацьракетамі, бадай, таксама), нават калі тую брыгаду перакінуць пад Берасьце.

Зьвязваць плянавае пераўзбраеньне беларускага войска зь ідэяй славутага «асымэтрычнага адказу» Масквы на амэрыканскую сыстэму супрацьракетнай абароны — вялікая нацяжка. Гэтая тэма выкарыстоўваецца найперш дзеля палітычных спэкуляцый.

Яшчэ болей. У выпадку зь сьвежымі заявамі Дземіздзюка, дырэктара па асаблівых даручэньнях «Расабаронэкспарту», атрымаўся клясычны сапсаваны тэлефон. Той, наадварот, даводзіў, што замежныя партнёры пачнуць атрымліваць «Іскандэры» з затрымкай, бо спачатку трэба ўкамплектаваць імі расейскае войска. Кажуць, цяпер усе наяўныя комплексы гэтага тыпу кінутыя на грузінскі напрамак. Ды і ўвогуле той «Іскандэр» яшчэ сыры, не даведзены да ладу.

Карацей, апраўданьне прадстаўніка расейскай «абаронкі» высілкамі журналістаў ператварылася ў пагрозу.

Ну а ягоную заяву, што ў Беларусі можа зьявіцца расейская брыгада супрацьпаветранай абароны, наш вайсковы экспэрт Аляксандар Алесін лічыць і ўвогуле надта сумнеўнай. Ён кажа: нават пры адзінай сыстэме СПА такой патрэбы няма. Болей лягічна ўзброіць навейшымі сродкамі беларускія часткі. З расейскай жа брыгадай многа тлуму і ў юрыдычным сэнсе: трэба ж надаць нейкі статус. Стварацaverage у нас замежную вайсковую базу, ці як?

На думку Алесіна, тэрмінова перакінуць расейскую брыгаду могуць хіба ў форс-мажорных варунках. Ну, напрыклад, каб тэрмінова закрыць украінскі напрамак, калі Кіеў надта ўжо рэзка пойдзе ў НАТА. Але і тады яшчэ вялікае пытаньне, ці захоча Аляксандар Лукашэнка псаваць дачыненьні з паўднёвымі суседзямі. Кладучы руку на сэрца, натаўскі трэнд Украіны — гэта выключна крамлёўскі галаўны боль.

Так, раней беларускі афіцыйны лідэр заявіў журналісту Wall Street Journall, што Беларусь абсалютна падтрымлівае Расею ў яе адэкватных дзеяньнях у адказ на разьмяшчэньне амэрыканскай сыстэмы супрацьракетнай абароны ў Чэхіі і Польшчы. Але гаворка ішла пра выключна расейскія захады — магчымае разьмяшчэньне «Іскандэраў» у калінінградзкім анкляве.

Гэты рэвэранс у бок Крамлю рэальна нічога не каштуе і разам з тым ня лішні напярэдадні цяжкага паседжаньня Найвышэйшай рады саюзнае дзяржавы і торгу вакол газу на 2009 год.

Рэальна ж улазіць у канфрантацыю з Эўропай праз расейскія амбіцыі Лукашэнку зусім недарэчы.

Нездарма ён так хваліў Абаму ў згаданым інтэрвію. Можа, малады амэрыканскі прэзыдэнт проста здыме тое пытаньне, адмовіўшыся ад плянаў ставіць радар у Чэхіі ды антыракеты ў Польшчы?

І яшчэ. Калегі-журналісты мяшаюць боб з гарохам, блытаючы супрацьпаветраную і супрацьракетную абарону. Ніякай сумеснай сыстэмы супрацьракетнай абароны Масква і Менск не плянуюць. Супольная ж супрацьпаветраная абарона дэ-факта ўжо існуе. Але ж, панове, «Іскандэрамі» не зьбіваюць самалёты! Гэтыя комплексы прызначаныя для зьнішчэньня важных аб'ектаў на зямлі: варожых штабаў, пускавых шахтаў, радараў. Адпаведна, імі ня ўзброіваюць аддзелы СПА. Ні расейскія, ні беларускія (вось С-400 Беларусь займела б ахвотна). Так што ня трэба рабіць сэнсацыяў на голым месцы.

І, нарэшце, апошняе. Калі ўжо казаць пра рэальны асымэтрычны адказ на амэрыканскую супрацьракетную абарону з дапамогай Беларусі, то тут ня трэба вынаходзіць кола. Дастаткова, каб Масква атрымала ў Мачулішчах аэрадром падскоку для сваіх Ту-22М3.

Гэтыя эўрастратэгічныя бамбавікі выкарыстоўвалі беларускія вайсковыя аэрадромы за часамі СССР і трымалі ў страху ўсю Эўропу.

Але пра гэты варыянт Менск — ні гу-гу. Беларускае кіраўніцтва добра разумее, што дражніць Захад такімі рэчамі было б недальнабачна. Ну а «Іскандэры» — так, агароднае пудзіла для слабанэрвовых.

## Эўропа з шырока заплюшчанымі вачыма

«XI Мінскі форум адрозніваецца ад папярэдніх у тым ліку складам і ўзроўнем удзельнікаў і дэманструе новыя, першыя крокі Беларусі і Еўрасаюза, скіраваныя на нармалізацыю адносін», — заявіў 11 лістапада на прэс-канферэнцыі ў сталіцы старшыня Мінскага форуму германскі палітолаг Райнер Лінднер.

Паводле слоў Р.Ліндэнра, форум прысвечаны двум важным тэмам: бяспека і развіццё рэгіёну пасля расійска-грузінскага канфлікту (еўрапейскія перспектывы Беларусі, удзел у Еўрапейскай палітыцы добрасуседства) і сусветны фінансавы крызіс. Мінскі форум пройдзе 13—15 лістапада.

У працы палітычнай секцыі возьмуць удзел дыпламаты, паслы, палітолагі, эксперты і дэпутаты з краін ЕС і краін — суседзяў Беларусі. Для ўдзелу ў эканамічным блоку пад эгідай АБСЕ запрошаны прадстаўнікі бізнесу, банкаўскага сектара, міністэрстваў і ведамстваў розных краін. Традыцыйна трэцяя секцыя прысвечана пытанням культуры, гісторыі і ідэнтычнасці, а таксама СМІ і інфармацыйнай прасторы Беларусі.

«Беларусь стала прадметам інтэграцыйнай канкурэнцыі з боку ЕС і Расіі, развіццё сітуацыі, як і форум, абяцае быць цікавым», — лічыць Р.Ліднер.

Ён падкрэсліў, што форум — гэта не толькі секцыі і выступленні, але і зносіны ў кулуарах.

Упершыню на адкрыцці форуму будзе прысутнічаць кіраўнік Адміністрацыі прэзідэнта Уладзімір Макей. Паводле слоў Р.Ліндэнра, яго ўдзел — «важны сігнал аб тым, што Беларусь зацікаўлена ў дыялогу».

Міністр замежных спраў ФРГ Франк-Вальтэр Штайнмаер упершыню перадасць прывітанне ўдзельнікам форуму. У ім ён кажа, што «Германія, як і ЕС, думае пра тое, як прагматычна і аператыўна ўключыць Беларусь у асобныя галіны Еўрапейскай палітыкі добрасуседства — энергетыкі, транспарту, транзіту».

На форум запрошаны прыблізна 300 удзельнікаў з розных краін, у прыватнасці з Беларусі, Германіі, Латвіі, Літвы, Польшчы, Расіі, Украіны, Фінляндыі, Швецыі.

БелаПАН

# Расейскі акцэнт

Ня толькі паспалітых людзей у Беларусі, але й палітолягаў-аналітыкаў менавіта гэта найперш зьдзівіла, узрадавала ці абурыла. Не малады, ці адукаваны, ці там харызматычны, а — чорны.

Піша Сяргей Дубавец.

Здавалася б, дарослыя людзі, і не 70-я гады на двары, калі можна было пачуць: дзеці, не глядзіце так на дзядзю, вы што, нэгра ніколі ня бачылі? А ўсё адно, першае, на што рэагуюць, — колер скуры. Хоць, як на мяне, дык яго элементарна ўявіць сабе і белым. І што ад гэтага зьменіцца?

Яшчэ ў менскай школе ў далёкія 1970-я мяне зьдзіўлялі праявы антысэмітызму. Не таму, што яны супярэчылі маральнаму кодэксу будаўніка камунізму, а таму, што інтуітыўна адчувалася, што яны нетутэйшыя, робленыя, а то й сьмешныя. (Недзе ў тыя гады адзін мацёры нацыяналюга апавядаў мне, што жыды ў Бабруйску вырабляюць на фабрыцы мыла з назвай «Беларусь» — каб беларусы штодня самі змывалі дарагое імя сваёй бацькаўшчыны…)

Як так, — думалася мне, — палова вучняў і настаўнікаў у школе — габрэі, палова дзяцей у двары таксама. Людзі як людзі.

Вось ксэнафобія расейцаў ня дзівіць. Бо тое, што там скінгэды забіваюць студэнтаў з Афрыкі, дзяўчынку-ўзьбечку і дворніка-таджыка, — ужо быццам бы й норма тэлевізійных навінаў. Яно, вядома, абурае, але ўжо ня дзівіць.

Расея, у якой замест нацыянальнай самасьвядомасьці сьвядомасьць імпэрская, ніколі й не магла быць шчырай у сваіх бясконцых здрадзіцах пра роўнасьць розных ды іншых. Якая роўнасьць, калі ёсьць «вялікі народ» і «вялікі язык»? Там заўсёды была Імпэрыя. А тут — санітарны кардон, «рыса аселасьці» для ўсіх, каму там было забаронена сяліцца, вучыцца, жыць. Таму тут спрадвеку быў кацёл народаў, культураў, рэлігіяў, моваў і фізыягноміяў. На Палесьсі жылі самыя сапраўдныя туркі, на Гарадзеншчыне — татары, у Магілёве — літоўцы, а па ўсёй краіне — габрэі. Людзі й людзі. Інакшасьць не рабілася падставай для эмацыйных ацэнак. Нездарма ж і слова «жыд» яшчэ ў пачатку мінулага стагодзьдзя ня мела для беларусаў адмоўнага адценьня. Толькі потым. Бо як можа быць лаянкавым імя народу?

Слова «нэгр» у «Слоўніку беларускай мовы» Івана Насовіча (1870) няма. Гэта значыць, што тады не было яго і ў рэчаіснасьці. Затое там ёсьць «мурын» — па-расейску «черный человек, арап». Прыклад ужываньня: «У пана нашага мурын служыць». Ёсьць, дарэчы, і мурынка — «загарэла, як мурынка». Так і цяпер кажуць. Паводле М.Фасмэра, абодва гэтыя словы лацінскага паходжаньня: негр ад niger — чорны, а мурын — ад maurus, маўр. Праўда, калі мурын прыйшоў да нас у сярэднявечны, хутчэй за ўсё, з Захаду, праз польскую мову, дык нэгр — у найноўшы час і, верагодна, з Усходу, з Расеі. У доказ Фасмэр прыводзіць зафіксаванае ў самарскім дыялекце слова «негра».

Беларусы, што выходзілі са свайго катла народаў, рабіліся нацыянальнымі героямі ЗША, ці Грэцыі, ці Чылі, дзе іх таксама ніхто не прымаў за чужакоў.

У расейскай «паласе аселасьці» Беларусь была цэнтральнай тэрыторыяй. Як у свой час была ключавой у Вялікім Княстве Літоўскім, дзе яшчэ Вітаўт адмяніў дыскрымінацыю ў дачыненьні да габрэяў і татараў. Адмяніў бы і ў дачыненьні да мурынаў, калі б тыя на той час былі хоць неяк прадстаўленыя ў нашым краі.

Праявы фобіі ў дачыненьні да іншых караліся паводле закону. І так было на працягу, бадай, паўтысячагодзьдзя, пакуль сюды не прыйшла Расейская імпэрыя са сваімі ўяўленьнямі пра закон і этыку чалавечых адносінаў, са сваім «вялікім языком» і «жыдоўскімі пагромамі», з праваслаўна-славянскай місіяй і «лицами кавказской национальности»…

Сярод парасткаў ксэнафобіі на нашай зямлі няма й каліва тутэйшага паходжаньня. Не таму, што мы такія добраныкія. Проста клімат ня той і абставіны ня тыя.

Дый надта доўга ў сваёй гісторыі мы самі на сваёй зямлі для ўсякіх вялікіх і місійных былі тымі ж нэграмі, мурынамі, чорнымі.

Калі ў 1970-я з экранаў тэлевізараў і з газэтных фотак не сыходзіла Анджэла Дэвіс, людзі ў нас казалі пра шкадаваньне да яе (бо апынулася ў турме), пра тое, ці прыгожая, пра фрызуру… Пра тое, што — чорная, каб так настойліва, — ня памятаю. Выходзіць, нешта зьмянілася?

naviny.by

# Камуністы кветкі клалі

Рэпартаж Зьмітра Панкаўца.

У Беларусі адзначылі 91-ю гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 году. Толькі ў нашай краіне на ўсёй постсавецкай прасторы гэты дзень працягвае быць дзяржаўным сьвятам. Зрэшты, едучы на плошчу Незалежнасьці праз вакно «соткі» бачыў міністра ўнутраных справаў Уладзімера Навумава, які ішоў на працу. Пэўна, няма ў яго ні выходных, ні сьвятаў.

Камуністы ж застаюцца вернымі сабе. І сёлета да помніка Леніну на плошчу Незалежнасьці прыйшло некалькі калёнаў прыхільнікаў вялікага кастрычніка. Гэтым разам і надвор’е спрыяла, ня тое што летась, калі ішоў вялікі сьнег.

Першымі традыцыйна прыйшлі сябры праўладнай КПБ. Разбаўленыя «камсамольцамі» з БРСМ. Іхны пікет быў самым масавым — некалькі сотняў чалавек. З савецкімі і сучаснымі чырвоназялёнымі сьцягамі. Усклалі кветкі. Пастаялі некалькі хвілін. Паганілі між сабой Калякіна, які «здрадзіў ідэалам камунізму і сядзіць на капіталістычных падачках».

Гэтым разам не было ганаровай варты і аркестру. Не было і доўгіх прамоваў. Павіншаваўшы адно аднаго са сьвятам, удзельнікі акцыі паехалі на «лінію Сталіна».

Потым падышла невялікая група, чалавек пятнаццаць, сяброў арганізацыі «За дэмакратыю, сацыяльны прагрэс і справядлівасьць». Паперадзе іхнай калёны ішоў нейкі хлопец са значком «Размаўляй са мной па-беларуску». Яны адзначылі, што «чарговую гадавіну Кастрычніцкай рэвалюцыі краіна адзначае ва ўмовах ілжэдэмакратыі». Але яны вераць, што Беларусь вернецца да сапраўднага сацыялізму. І пайшлі ўскладаць кветкі да шыльды Сьвярдлову.

Адна жанчына ўсклікнула, што, паводле яе інфармацыі, у хуткім часе вуліцу Сьвярдлова зьбіраюцца пераназваць. Гэтая «вераломная зьмена назваў вуліц» выклікала бурную рэакцыю ў камуністаў, і яны зьбіраюцца «дабівацца гістарычнай праўды».

«І гэтыя людзі яшчэ будуць папракаць апазыцыю ў раздробленасьці», — казаў нехта з калегаў, калі да Леніна падыходзіла чарговая партыя камуністаў.

Самымі калярытнымі былі, як заўсёды, бальшавікі з ВКПБ, якіх было некалькі дзясяткаў. Традыцыйныя партрэты Сталіна і Леніна, чырвоныя сьцягі, расьцяжка «Далоў капіталізм».

За што падабаюцца камуністы, дык гэта за іхны аптымізм. Штогод яны знаходзяць сусьветныя тэндэнцыі, якія сьведчаць пра тое, што сьмерць капіталізму і перамога сацыялізму непазьбежныя. Летась гаварылі пра прыход сацыялістаў да ўлады ў краінах Лацінскай Амэрыкі, сёлета — пра сусьветны фінансавы крызіс.

«Калі ў Савецкім Саюзе ты клаў у банк рубель ці дзесяць рублёў, то і праз дзесяць гадоў яны не абясцэньваліся», — казаў правадыр бальшавікоў. Сёньняшнюю сытуацыю ў краіне ён назваў «перамогай контрарэвалюцыі», але крызіс усё паставіць на свае месцы. Бальшавікі ж пасьля Леніна пайшлі да бюсту Дзяржынскага.

Апошнім пунктам праграмы было ўскладаньне кветак ад суб’екту АДС Партыі камуністычнай беларускай. Ужо другі год запар яны прыходзяць без усякіх сьцягоў і расьцяжак. Проста ўсклалі вянок.

Нікога зь лідэраў не было. Казалі, што Сяргей Калякін у камандзіроўцы, дзе — не ўдакладнілі, а яго намесьнік Валер Ухналёў у гэты дзень ускладаў таксама кветкі да помніка Леніну. Што праўда, у Капэнгагене.

ПКБоўцы адзіныя пасьля ўскладаньня разышліся па хатах, а не накіраваліся да іншых лідэраў рэвалюцыі. Такі вось традыцыйны фармат 7 лістапада.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

## «Маладафронтаўцаў» пакаралі абы пакараць



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

**10 лістапада ў судзе Ленінскага раёну Менску прайшлі працэсы над затрыманымі 7 лістапада насупраць будынку КДБ сябрамі незарэгістраванага «Маладога фронту». Аляксей Янушэўскі, Наста Палажанка, Наста Лойка, Тацяна Шапуцька, Антон Русін трымалі расьцяжку «Камунізм пад трыбунал!» Іх пакаралі трыма суткамі арышту — адседжанымі да суду ў спэцпрыёмніку на Акрэсьціна. Такім чынам, ім ня трэба будзе вяртацца ў турму. Усе суды былі нядоўгімі. Прысуды віталі воплескамі. На фота: Наста Палажанка ў залі суду.**

## СЬЦІСЛА

### Праўнук Бісмарка мяркуе адкрыць у Беларусі фабрыку калядных цацак

Сям’я Аляксандра фон Бісмарка — праўнука канцлера Нямеччыны Ота фон Бісмарка — мае ў Беларусі эканамічныя інтарэсы. «Цяпер мной разглядаецца пытаньне пра магчымасьць адкрыць у Беларусі фабрыку елачных цацак», — кажа Аляксандар фон Бісмарк.

### Беларусь апусьцілася на пяць радкоў у сусьветным футбольным рэйтынгу

У параўнаньні з кастрычнікам зборная Беларусі апусьцілася на пяць радкоў (адыграла ролю параза ад Англіі). Цяпер айчынная зборная займае 64-ы радок з 507 баламі (гэта 34-е месца ў Эўропе). 63-і — Альжыр, Латвія — 65-я.

### Некалькі раёнаў Браншчыны хочуць далучыцца да Беларусі

У шэрагу раёнаў Браншчыны прайшлі народныя сходы, дзе прымаліся звароты да мясцовых саветаў з просьбай далучыцца да Беларусі. Гэта ня першы падобны выпадак на Браншчыне. Некалькі гадоў таму пра жаданьне ўвайсьці ў склад Беларусі заяўляў Краснагорскі раён. Гэты рэгіён канчаткова адышоў ад Беларусі ў 1919 г.

### Прэзыдэнт Калмыкіі трапіў у аварыю

Кірсана Ілюмжынава шпіталізавалі з страсеньнем мазгоў у адну з элітных лякарняў Масквы. Аўто прэзыдэнта Калмыкіі сутыкнулася зь іншым легкавіком, якім кіравала 21-гадовая дзяўчына. Сьледзтва высьвятляе акалічнасьці.

### «South Park» у Басманным судзе

У Басманным судзе Масквы пачаўся разгляд скаргі тэлеканалу 2x2 на тамтэйшую пракуратуру. Яна вынесла тэлеканалу папярэджаньне пра прызнаньне адной з сэрый мультфільму «South Park», паказанай па 2x2, экстрэмісцкай. На думку пракуратуры, мультфільм прыніжае гонар і годнасьць хрысьціянаў і мусульманаў. Мульцік для дарослых «South Park» высьмейвае недахопы грамадзтва, забабоны й табу. У ім трапляецца чорны гумар ды нецэнзурная лексыка. Асобныя сэрыі перакладзеныя па- беларуску.

**ЗП, АК, charter97.org, newsru.com, радыё «Свабода»**

# Псыха-панка-гранджа-мэтал-хард-«Рок-школа»

Як выхаваць рок-зорку? Рэцэпт: «Бярэм альтэрнатыў-постгранжыста кантры-кор-мэталіста і паган-блюз-рэйвіста, кідаем іх у адзін кацёл (клюб «Гудвін») і пад шэфствам Віталя Супрановіча, кіраўніка «Беларускай музычнай альтэрнатывы», гадуем вартую альтэрнатыву нішчымным калдунам і саладухам беларускай музычнай кухні». Пра праект «Рок-школа» піша **Павал Касьцюкевіч**.



АЛЕСЬ КУДРЫЦКІ

**Дзявочы гурт Restart.**

— Ці можна выхаваць рок-зорку? — хітравата, па-ільічоўску, усьміхаючыся, перапытвае галоўны ўлісавец Слава Корань. — Выгадаваць, пэўна, не. Але падказаць сёе-тое, скіраваць у слушнае рэчышча можна. Напрыклад навучыць маладняк такім базавым рэчам, як запіс.

— Выхаваць рок-зорку? — цяпер пераймае нас імпазантны Вітаўт Мартыненка, адзін з аўтараў зборніку «222 альбомы беларускага року». — Рок-школа — гэта хутчэй ня спосаб выхаваць рок-зорку, а нагода знайсьці яе. У нас жа процьма талентаў! Да таго ж, мы кажам ня толькі пра выканаўцу, а пра цэлы гурт, а гэта ж індустрыя: гурт укладае грошы — купляе апаратуру. Выгадаваць немагчыма, а даць выказацца і дапамагчы раскруціцца — гэта можна.

Цалкам вераемна, што менавіта ад нежаданьня рок-сьветачаў выхоўваць у строгасьці будучых зорак, моладзь на «Рок-школе», як і ўсе папярэднія «выпускі» рок-музыкантаў за апошнія гадоў 40, атрымалася хуліганская, маральна раскладзеная і далёкая ад народу.

### Хуліганская

Сьвята непаслухмянасьці ішло спраўным чынам. Мала таго, што «Кашлаты Вох» наогул адмаўляецца ад традыцыйных інструмэнтаў і бяз звыклых фузоў рэжа фальклёрную дударскую музыку, дык іхны гітарыст яшчэ на пытаньне, што зробіць за першым заробленым мільёнам, адказаў: «Я ведаю, што нашыя хлопцы зробяць са сваёй доляй, — адразу прап'юць. А я вось ня ведаю: ці адразу прапіць, ці сьпярша купіць гітару, а ўжо потым яе прапіць».

Аптымістычныя шпанюкі з гурта, што меў быцццам бы патрыятычную назву СкаРБ, хоць і драйвова прапяяўшы, адказалі, што на першы зароблены гітарным мазалём мільён купяць якісьці востраў і зъедуць туды «з вагонам 98-га» на ПМЖ, а першы вялікі канцэрт хацелі б даць не ў халоднай Радзіме, а на сонечнай Ямайцы. І толькі «голыя манахі», былыя панк-хуліганы, скрасілі карціну: пад іх апакаліптычна-інтэлігентны сплін было хораша і амаль спакойна.

### Маральна раскладзеныя

Канцэрт праходзіў пад эгідай ўсебеларускай ініцыятывы «Будзьма!», якая займаецца папулярызацыяй беларускасьці. Вядоўца, Віталь Маліноўскі, паспрабаваў апавесьці пра тое публіцы, але, як высьветлілася, гэта рабіць было ня варта. «Чым займаецца спонсар мерапрыемства, ініцыятыва «Будзьма!»?» — пытае ён. «Выпіць», — нясецца з танцполу. «У прынцыпе правільна, — азадачана адказвае вядоўца. — «Будзьма!» як тост займаецца выпіць. Не, пачакайце, ня блытайце мяне: «Будзьма!» як арганізацыя чым займаецца?» «Сэксам», — натхнёна сачыняў на хаду натоўп. «Правільна...» — ужо стомлены выбрыкамі публікі з усім пагаджаецца Маліноўскі.

Тым часам на сцэну вылез нейкі завіталы на агеньчык таварыш і ў мікрафон сказаў сакральную для таго, каму не хапае, фразу: «Яізьвіняюсьрэбята!» Але гэтым разам вядоўца не разгубіўся: «Дзякуй, даражэнькі, што вы апавялі нам гісторыю свайго жыцьця і да пабачэньня!». Расчулены ветлым зваротам, таварыш па-братэрску абняўся і паступова, на нягнуткіх нагах, рэціраваўся са сцэны.

Потым усёй заляй выклікалі дух Піта Паўлава. Дух тым часам сядзеў за столікам на другім паверсе і асабліва не сьвяціўся.

### Далёкія ад народу

На пытаньне, у якім стылі яны граюць, Сьвета Жаркевіч, басістка менскага гурту Restarty, не міргнуўшы вокам, адказала: «крастава-псіхадэлічна-сымфа-мэтал-хард-кор з элемэнтамі індустрыяльнага панк-року і готыкі». І праз каторы час жаночая банда сапраўды выкінула гэта ўсё ў музычным эквіваленце на ашалелую публіку. Дзяўчаты далі такога чаду, што выходзіць з клюбу неяк не хацелася. Хацелася памерці. Ад ракенрольнага шчасьця.

А калі шчыра, дух сапраўднага року лунаў у «Гудвіне». І як дадаў Вітаўт Мартыненка, хоць рок-музыку асабліва ня выгадуеш, але гадаваць варта, бо колькі можна зацыклівацца на «Краме» і N.R.M.?»

# Палац Валовічаў у Сьвяцку выставілі на чарговы аўкцыён

Стартавы кошт складае 8 млн даляраў ЗША. Таргі маюць адбыцца 9 сьнежня.

Паводле ўмоваў аўкцыёну, будучы інвэстар мусіць цягам месяцу пасьля набыцьця падпісаць ахоўныя абавязальніцтвы зь Міністэрствам культуры, а праз тры гады — пачаць гаспадарчую дзейнасьць. Цалкам магчыма, што былы палац Валовічаў ператвораць у гатэль. Такі праект перадугледжвае таксама аднаўленьне і добраўпарадкаваньне старога парку, закладзенага пры канцы XVIII ст.

Папярэдне помнік архітэктуры канца XVIII ст. ацанілі ў паўтара мільярды рублёў.

Палацава-паркавы комплекс у Сьвяцку Гарадзенскага раёну знаходзіцца ў сьпісе помнікаў рэспубліканскага значэньня. У гэтым рэгіёне ў сьпіс трапіў таксама Аўгустоўскі канал.

Палац у стылі барока збудаваў італьянскі архітэктар Джузэпэ Сака, які зьяўляецца аўтарам іншых будынкаў, створаных у суседняй Гродні ў часы апошняга караля Рэчы Паспалітай Станіслава Аўгуста Панятоўскага.

За палякамі тут была створаная наркалягічная лякарня, адзіная на той час у Польшчы. Да 2005 году тут месьцілася сухотная лякарня. Апошнія тры гады палац пустуе і паступова разбураецца.

**СП, паводле s13.ru**



GLOBUS.TUT.BY

**Палац Валовічаў у Сьвяцку. Час будаўніцтва — 1779 г.**

## НОВЫЯ КНІГІ, ДАСЛАНЫЯ Ў РЭДАКЦЫЮ

### «Уладар Пярсьцёнкаў» па-беларуску

Усьлед за першым томам, «Зьвяз Пярсьцёнку», што выйшаў таксама сёлета, перакладчыкі Дзьмітры Магілеўцаў і Крысьціна Курчанкова выдалі «Дзьве Вежы» — другую частку «Ўладара Пярсьцёнкаў», самай чытанай фэнтэзійнай сагі ў сьвеце. Джон Рональд Руэл Толкін пакрысе абеларушваецца. Разам ужо выйшлі тры кнігі князя фэнтэзі: «Хобіт», «Зьвяз Пярсьцёнку» і «Дзьве вежы». «Дзьве Вежы» можна набыць на ўправе БНФ, сайтах knihi.net і oz.by.

**Толкін Дж. Р. Р. Уладар Пярсьцёнкаў: Дзьве вежы.** Пер. з анг. Дз. Магілеўцава і К. Курчанковай. — Менск, 2008. — 354 с.

### Верхам на ваўку

Паглыбляцца ўсё болып у нязнаныя рэгістры жыцьця. Кранаць не заўсёды зьвыклыя тэмы, апавядаючы пра браслаўскую дзяўчынку верхам на ваўку, пра пах рук у ружоўніцы, пра дзядоўскіх яблынь шлюбнае сутоньне, пра сябе, вартаўнічку спакою позьніх кветак.

І яшчэ «Ружоўніца» — кніга-кветнік, дзе расьліны — ня вынік біялягічнай эвалюцыі, а плод радаводнай драмы, карэньні іх тояць сямейныя суплёты, а то часам — бач ты! — могуць прарастаць назад, у сьвет людзей. Загарнуўшы апошнюю старонку, дзівуесься, як так можа быць, што дагэтуль няма такой кветкі — аксак.

**Ружоўніца. Вершы. Валянціна Аксак.** Менск: Логвінаў, 2008. — 72 с. 300 ас.

### Ягоная рака

Знаны пісьменьнік і кінасцэнарыст, прадстаўнік пакаленьня дзяцей вайны, Анатоль Кудравец дае грунтоўныя накіды постацяў беларускай літаратуры і мовазнаўства. Апісвае збольшага старэйшае пакаленьне, у якім шмат хто ўжо выправіўся за далёкі прычал. «Мележ, Брыль, Быкаў, Караткевіч, Стральцоў... Я не выбіраў імёнаў, — піша ў прадмове да сваёй кнігі Кудравец. — Яны выбраліся самі». Піша, ацэньваючы іхны творчы дарабак і агледзячы іхны (і свой) жыцьцёвы шлях. Піша на пераправе паміж асабістым і грамадзкім, дзе і нараджаецца літаратура, а душа сустракае душу.

**За дальнім прычалам. Літаратурныя партрэты. Анатоль Кудравец.** — Менск: Мэдысонт, 2007. 300 ас. — 224 с.

### «Кнігазбор» выдаў Станкевіча

У менскім выдавецтве «Кнігазбор» накладам у тысячу экзэмпляраў выйшаў том выбраных твораў ксяндза Адама Станкевіча — 44-я кніжка сэрыі «Беларускі кнігазбор». Складальнікам, аўтарам прадмовы і камэнтароў зьяўляецца доктар філязофскіх навук Уладзімер Конан.

Кнігу выдатнага дзеяча адраджэньня, аднаго з заснавальнікаў і лідэраў Беларускай хрысьціянскай дэмакратыі, сьвятара Адама Станкевіча склалі самыя значныя ягоныя працы. Сярод іх — манаграфіі «Хрысьціянства і беларускі народ», «Родная мова ў сьвятынях» і «Да гісторыі беларускага палітычнага вызваленьня».

У раздзел «Божае слова» ўключаныя лекцыі, Эвангельлі і прамовы на нядзелі і сьвяты, артыкулы і рэцэнзіі. У том аб'ёмам 362 старонкі ўвайшло 18 ілюстрацыяў вокладак кніг і фотаздымкаў.

**Адам Станкевіч. Выбраныя творы.** — Менск: «Беларускі кнігазбор», 2008.

**Лявон К, БелаПАН**

# Ірына Дарафеева



Девушка на берегу. Песьні Кіма Брэйтбурга, West Records, 2008

Альбом не найгоршы, але немаведама каму патрэбны.

Чарговы рэверанс у бок усходніх суседзяў ад беларускіх эстраднікаў. Гэтым разам вядзецца ня проста пра няўцямнае прыпадабненьне да зорак расейскіх тэлеканалаў, а пра «беларуска-расейскі праект» (так яго назвала сама Дарафеева), то бок з укладаньнем агульных глуздоў ня самых апошніх асобаў у шоў-бізе «саюзнай» дзяржавы. «Расейскі альбом» Дарафеевай — гэта набор штампаў, уласьцівых расейскамоўнай папсе, сляпанай на хуткую руку са зваротам да народных казак («33 богатыря»), савецкай эстрады 60-х («Это неизбежно») ды да звышнеўтаймоўнага патрыятычнага пастасу («Сердце земли моей»). Часам складаецца ўражаньне, што чуеш ужо даўно забыты голас якой Апінай ці Салтыковай (але окэй, Дарафеева сьпявае лепей). Хоць месцамі адчуваецца рука старога арт-рокера Кіма, якому ня трэба прыкладаць асаблівых намаганьняў, каб стварыць запамінальную поп-мэлёдыю («Ангел мой»). Альбом у Ірыны не найгоршы ў дыскаграфіі, але немаведама каму патрэбны.

# Tanin Jazz



Feel this time, West Records, 2008

Па выніку складаецца ўражаньне, нібы добра прабавіў час у джакузі.

Дэбютны альбом Tanin Jazz перакрэсьлівае ўсе імкненьні «зорак» беларускай поп-музыкі дасягнуць прыстойнага і прыемнага гуку. Гэты праект абсалютна вольна пачуваецца ў розных плынях і здольны на экспэрымэнты, як з электронікай, так і з жывым гучаньнем. Гэтыя два пачаткі суседзяць на «Feel this time». Але па выніку ў «Feel this time» дасягаецца абсалютная гармонія стыляў. Ад таго і трактаваць іх творчасьць можна ў залежнасьці ад уласных упадабаньняў — іхны выступ несумненна будзе глядзецца дарэчы і на «Песні году», і на «Сінім перцы». Тут ужо гледзячы ў які бок музыкі вырашаць парушыць гэты «альбомны» балянс. Усе песенькі на дыску ненавязьлівыя і малазапамінальныя (прынамсі, зь першых некалькіх разоў праслухоўваньня), але па выніку складаецца ўражаньне, нібы добра прабавіў час у джакузі. А яшчэ было б цікава пабачыць вакальны двубой Таццяны Гарошкі і Насты Някрасавай — уладальніцаў самых прыгожых на сёньня галасоў у беларускай музыцы. Самыя ўдалыя трэкі: «Feel this time» (гэта той выпадак, калі пра песьню кажуць «маленькі цуд»), «Звездочёт», «Город».

# Разьбітае сэрца пацана




Розавы закат, БМА-груп, 2008

Гэта ўсё той жа герой першых песьняў Сяргея Міхалка — блазнаваты няўрымсьлівы юнак з сумнымі вачыма — які ў новых абставінах стаўся ахвярай ідэалёгіі.

Дзёня і Пашка пайшлі яшчэ далей за сваіх гуру — Сашу і Сірожу, давёўшы да поўнага абсурду спосаб мысьленьня і асаблівасьці маўленьня паасобных прадстаўнікоў тутэйшага грамадзтва. Пяецца ад асобы простага сэнтымэнтальнага хлопца. Па сутнасьці, гэта ўсё той жа герой першых песьняў Сяргея Міхалка — блазнаваты няўрымсьлівы юнак з сумнымі вачыма, — які апынуўся ў новых абставінах і стаўся ахвярай дзяржаўнай ідэалёгіі. Цяпер, каб прыцягнуць дзявочую ўвагу, ён ня толькі купляе жуйкі, але і абвешваецца « бээрэсэмаўскімі» значкамі («Я буду прыгаць і громка звінець, ведзь у значках зашыбенная медзь» — шык!) Немудрагелістыя рыфмоўкі «пацаноў» запамінаюцца зь першага разу і назаўжды. Дагэтуль помніцца адзін зь першых іхных гітоў, які так і ня быў запісаны — «Ты мне не званіш, не тэлефануеш — рэўнуууеш». Пры ўсім гэтым гурт не пайшоў на наўмысную прымітывізацыю сваёй музыкі, як тое часта бывае з «трасянкавымі» выканаўцамі, а наадварот, пашырыў стылістычныя межы. Дзёня часам ные, як той Стыў Тайлар, а Пашка з флейтаю дае чаду, не раўнуючы Ян Андэрсан. На «Розавым закаце» чуем водгукі францускай музыкі 70-х, дыска 80-х і року 90-х. Во яны — сапраўдныя героі беларускага «Камэдзі»! Але для белТВ занадта сьмешна яны жартуюць.

# Макс Лорэнс




Танцы под луной, Go-Records, 2008

Напладзіў Сярога «эрэнбі»-праектаў.

Напладзіў Сярога вакол сябе «эрэнбі»-праектаў. Лорэнс выглядае на фоне Б'янкі інтэлектуалам, але ўсё роўна не дае падставаў назваць гэта музыкай, вартай увагі. Макс у свой час з радасьцю забіў на сумнеўны статус «зоркі беларускай эстрады» і пайшоў на бэк-вакал у праект «Сярога», а потым пад уплывам кемлівага гомельскага рэпера перарадзіўся ў моднага «эрэнбі»-выканаўцу. Праўда, сілаў у яго хапіла на напісаньне ўсяго некалькіх твораў, астатнія словы да песьняў (і часткова музыку) напісаў уласна Сярога. Пра шчырасьць казаць ня будзем, магчыма, дадзеныя сьпевы крануць якое дзявочае сэрца (з найбольш верагодных варыянтаў — «Mon ami» з тым жа Сярогам). У астатнім гэтае сьпяваньне па складах, «прэсьнякоўскае» вішчаньне ды аднастайны біт здольныя вывесьці з стану раўнавагі нават самага цярплівага слухача. Тым ня менш, на «Танцах..» можна сустрэць пару трэкаў, якія, прынамсі, не нэрвуюць — загалоўны, «Те espero» і «Паўтарай на раз-два-тры».

**Сяргей Будкін**

# Кліп, складзены з старых фота



Гурт «Ляпіс Трубяцкой» прэзэнтаваў кліп на сваю новую песьню «Агеньчыкі». Гэта адна з самых прыгожых і лірычных песьняў за ўсю гісторыю групы, сьцьвярджае сайт гурта. Рэжысёр кліпу — Аляксей Цярахаў, той самы, што стварыў анімацыю для кліпаў «Ау», «Ружачка» ды «Капітал».

«Я даўно выношваў ідэю стварыць псэўда-3D, аніваваць фоткі, — узгадвае Цярахаў. — Працаваў над гэтым гадоў пяць, адточваў тэхніку, рабіў тэсты па графіцы. А калі пачуў «Агеньчыкі», рашэньне прыйшло імгненна: буду рабіць рэтра-кліп з фатаздымкаў позьнесавецкай эпохі».

Выкарыстаньне савецкага візуальнага шэрагу ў сучаснай маскультуры — дастаткова пашыраная зьява. Але, у адрозьненьне ад многіх іншых прыкладаў такога прыёму, анімацыя Цярахава атрымалася сапраўды густоўнай. Гэта — настальгія не па савецкім ладзе, а па дзяцінстве, якое засталося на старых фатаздымках.

**Алесь Бондар**

## Аляксей Цярахаў пазбавіўся прывіду «Капіталу»

Кожны кліп Аляксея Цярахава — гэта падзея ў беларускім відэамастацтве. Дванаццаць гадоў таму ён стварыў з дапамогай фотаапарата «Зэніт» свой першы ролік «Ау» — на песьню «Ляпіса Трубяцкога», што гучала тады з кожнага музычнага шапіка. Ад разу да разу крэатыву болела: «Ляпісаўскую» ж «Розачку» Цярахаў зьняў на 30 фотаапаратаў ФЭД, а для кліпу ТТ-34 скарыстаў здымкі Пэнтагону і ваенна-паветраных сілаў ЗША.

Самая ж знакавая праца і ня толькі для Аляксея і ўсяго айчыннага кліпмэйкерства — «Капітал» усё тых жа «ляпісаў», які сабраў дзясяткі ўзнагародаў па ўсёй Эўропе. Праўда, па БТ так і ня быў паказаны праз прысутнасьць у ім Ахмадзінэджада, Чавэса і кіраўніка Беларусі. Новая праца Цярахава на песьню Міхалка «Огоньки» ўмомант займела посьпех, атрымаўшы галоўны прыз у намінацыі «Найлепшая анімацыя» на фэсьце музычнага відэа VIMUS у Партугаліі. Беларускі кліп апярэдзіў працы The Chemical Brothers і Bjork. Гэты кліп Цярахаў рабіў далёка за межамі краіны. Беларускі кліпмэйкер ужо паўгоду як перабраўся ў Канаду: «У мяне тут сын вучыцца ў трэцяй клясе і жонка тут. Раней даводзілася адрывачна езьдзіць. Жылі спачатку на Ньюфаўлэндзе. Там на ўсім востраве 500 тысячаў чалавек, а ў сталіцы правінцыі — 150 тысячаў. Пекната, але няма аніякага руху, таму давялося пераехаць у Таронта. Тут жыве шмат выхадцаў зь Беларусі. Асаблівa выпускнікоў менскай мастацкай вучэльні. Нiяк не магу вывучыць ангельскую».

Кліпмэйкер ня лічыць свой сёньняшні стан эміграцыяй, але ў Беларусь пакуль вяртацца не зьбіраецца. «Лічу, што няма розьніцы, дзе знаходзіцца фізычна, каб рабіць нешта для сваёй краіны. А я раблю тую ж працу, што і ў Менску», — лічыць ён. У Канадзе А.Цярахаў ужо рыхтуе кліп на адну зь песьняў з альбому «Ляпіса Трубяцкога» — «Маніфэст».

**Сяргей Будкін**

# Беларусь вачыма італьянца

Фатограф Масіміліяна Кляўзі нарадзіўся ў Генуі ў 1979 г. Ён ляўрэат некалькіх міжнародных конкурсаў, яго працы друкавалі «D la Repubblica delle Donne», «L'Espresso». Сфэра зацікаўленьняў Масіміліяна — гуманітарныя і сацыяльныя праблемы. Ён здымаў у Косаве, Турцыі, Румыніі, Індыі. Наведаў Масіміліяна і Беларусь. Так выглядае Менск у яго аб'ектыве.



**Цэнтральны рынак мае відавочныя адбіткі савецкай спадчыны. Нягледзячы на тое, што крамы прыватныя, выгляд (уніформа прадаўцоў) і цэны аднолькавыя.**




**Недзяржаўныя выданьні забароненыя для продажу на вуліцы і крамах.**



**Сартыроўка кароў падчас даеньня.**



**Міліцыянты на Плошчы Перамогі, Менск.**



**Дзяўчына ў мэтро.**

**Паводле www.emmeclausi.it**

## Трэба шукаць новае

**Ужо прайшоў час пасьля парлямэнцкіх выбараў.** Нягледзячы на тое, што гэтую палату не прызналі эўрапейскія назіральнікі, гэтую кампанію можна лічыць для дэмакратаў правальнай. Туды ня трапіў ніводзін апазыцыянэр, ня выгандляваўшы дэпутацкія пасады ва ўладаў і Эўрасаюзу. Але гэты промах ім можна прабачыць, бо насамрэч выбары былі сфальсыфікаваныя. Галоўная праблема ня ў месцах, а ў тым, колькі чалавек выйшла пратэставаць. Вось тут мы і бачым, як дэмакраты правялі выбары. Невялічкі натоўп, несплянаваныя дзеяньні — вось як праходзіла Плошча-2008. Усе буйныя дзеячы апазыцыі на прэс-канфэрэнцыях адзначылі толькі свой удзел, ніводзін не запытаўся, чаму не адбылося моцнага пратэсту, дзе людзі. Толькі Л.Баршчэўскі сумленна прызнаў правал на выбарах. Адбылося як заўсёды: спачатку баявы настрой, потым правальны вынік. Цяпер зноў стаўка робіцца на прэзыдэнцкую кампанію, спадзяюся, вынік будзе іншы. Варта ўзгадаць дзеяньні Эўрасаюзу. Нягледзячы на выбары, зьнятая забарона на ўезд высокіх чыноў, уключаючы Лукашэнку, хоць толькі на паўгоду. Я лічу гэтую тактыку станоўчай. Старая з забаронамі і санкцыямі не давала плёну. Вось яна і зьмененая на больш мяккую. У адрозьненьне ад дэмакратаў, Захад шукае нешта новае. Сапраўды, чаму б не скарыстаць момант?

**Зьміцер Чалевіч, Капыль**

## Памяці Катажыны Краеўскай

**5 лістапада памерла пані Катажына Краеўска — вялікая сяброўка беларусаў і надзвычай сьветлы ды добры чалавек.**

«Сядай. Выпі гарбаты, супакойся і патэлефануй сям'і. Нешта зараз прыдумаем», — гэтак прывітала мяне пані Кася ў 2001-м, калі давялося прыехаць у Варшаву, дзе не было знаёмых, не было дзе пераначаваць, не было з кім проста пагаварыць.

А пазнаёміліся мы парай гадоў раней на курсах для журналістаў правінцыйных СМІ ў Варшаве. Разам з жонкай Аленай складалі тады бюлетэнь Пінскага аддзяленьня БХК «Маю права!» У польскую сталіцу нас запрасіла Фундацыя польска-чэска-славацкай салідарнасьці: падвучыцца, але і атрымаць кампутар для рэдакцыі — вельмі важная тады для нас была падтрымка. Працай фундацыі кіравала Катажына Краеўска — сівая худзенькая пані з надзвычай добрай усьмешкай і цёплымі далонямі.

За два тыдні, што былі на курсах, яна зрабілася нам амаль родным чалавекам. Пах гарбаты і печыва ў невялічкім пакоіку Фундацыі на Шпітальнай... Заўсёды гасьцінная пані Кася...

Потым пані Кася «штосьці прыдумала», як і абяцала. У Варшаве яна дапамагала як магла. Дзякуючы ёй мы мелі жытло першыя два месяцы. Задарма. Маглі карыстацца офісам. Задарма. Потым тэлефанавала, хоць і не павінна была: «Аляксей, тут імпрэза цікавая будзе, прыходзь, зрабі што для радыё...» Пані Кася дапамагала ня толькі мне і маёй сям'і. Шмат хто з маіх знаёмых, з розных краінаў, успамінае яе добрым словам. Не адзін беларускі журналіст прыгадае зараз гэтую жанчыну...

Я няшмат ведаў пра Катажыну Краеўску. Ня быў сябрам ці блізкім знаёмым. Зрэдзьчасу званіў. Штодзень злучаў нас хіба што бацік аўтарства маёй жонкі, які Алена падаравала пані Касі на знак павагі і ўдзячнасьці.

Але калі пачуў, што яна адышла ў лепшы сьвет, — моцна кальнула ў сэрцы. Сьветлы быў чалавек, сябра беларусаў. Сябра, якіх рэдка сустракаеш у жыцьці. Сьветлая памяць.

**Аляксей Дзікавіцкі, Варшава**

## Мараль

**Крыху сьпяшаюся.**

Адчыняю дзьверы аўтавакзалу, нехта адразу ляпае па плячах.

— Ты ў Брэст, беларус?

— Так, у Берасьце, — бачу твар «таксоўшчыка», які нядаўна мяне падвозіў і цяпер выказваў шчырую радасьць, напэўна, думаючы: «Вось, яшчэ аднаго пасажыра падчапіў!»

«Таксоўшчыкі» — тут гэта людзі, якія прапаноўваюць даехаць да пэўнай кропкі на сваім аўтамабілі, звычайна гэта каштуе прыкладна столькі ж, колькі на грамадзкім транспарце, але атрымліваецца крыху хутчэй, таму я й пагадзіўся.

Побач са мной дзяўчына, праз некалькі хвілін да нашай кампаніі далучыўся яшчэ і хлапец. Малады кіроўца задаволены: «Зараз ужо паедзем, вось толькі яшчэ аднаго чалавечка падчэпім». Напэўна, ягоны добры настрой спарадзіў і выплеснуў вонкі ўсю «прыгажосьць» ягонай культуры паводзінаў. Кіроўца з пэўнай агрэсіяй чапляўся да мінакоў з адным і тым жа пытаньнем. Жаданьне ехаць зь ім імгненна зьнікала. Дзяўчына, што стаяла побач, зрабіла заўвагу:

— Спадар, пляваць у грамадзкім месцы некультурна!

— Девушка, не учите меня тому, что мне нужно делать!

Шчыра кажучы, не чакаў такога рэзкага адказу, але ён зусім зьнішчыў маё жаданьне ехаць з гэтым чалавекам, таму заявіўшы, што паеду на маршрутцы, я пакрочыў да касаў. Стоячы ў чарзе, праз хвіліну заўважыў, што да мяне далучылася й ужо знаёмая дзяўчына, а за ёй і хлапец.

Час прайшоў, я заходжу ў толькі што прыбылую маршрутку, позірк мой на сэкунду запыніўся на тым самым «вольным» кіроўцы, што самотна стаяў ля дзьвярэй і што сваімі нахабнымі ўчынкамі страціў хоць і невялікі, але блізкі прыбытак. Пра што ён у гэты момант разважаў, ці пра свае некультурныя дзеяньні, ці пра ізноў няўдалы дзень, я ня ведаю, але ўпэўнены, што мараль у гэтай гісторыі ёсьць.

**Юры Бакур, Берасьце**

## Абразкі зь сельскагаспадарчых работ

**Памятаеце ў Высоцкага: «На чём проверяются люди, если войны уже нет...»** Сапраўды, калі чалавека ўключыць у іншую абстаноўку, больш экстрэмальную, чым будзённая, ён «раскрываецца» — пазнаецца і хутчэй, і глыбей. За многія гады працы восеньню ў калгасах было ўсякае. Стагналі-валяліся ў градках асфальтава-гарадзкія дзеці. Тады ж начавалі «па баб-ках» ці ў інтэрнатах, піянэрскіх лягерах, а як прасушыцца, калі падмокнеш?! Бывалі канфлікты зь «мясцовымі». А як дзяўчаты рваліся на ўсялякія дыскатэкі і да кавалераў, а хлопцы — на змаганьне з «вогненнай вадой»! Бывалі й забастоўкі. Але ж працавалі!

Тая абыякавасьць, што я ўбачыў сёлета, нават шакавала. 18-гадовыя юнакі праз паўгадзіны ад пачатку «бульбяной страды» марыліся, сядалі кружком і «адпачывалі» з дапамогай... сосак-цыгарэт. Спробы праз дыялёг «дастукацца» да іх прыводзілі да таго, што хлопцы ўнікалі размовы. Адна з рэдкіх рэплікаў: «Что Вы смотрите в прошлое?!»

Што гэта — іхная віна ці бяда? Адказ на падобнае пытаньне асабіста для мяне зусім не трывіяльны.

І на вёсцы цяпер парадкі іншыя. Бесталковасьці, безгаспадарчасьці хапала заўсёды. Але ж... Сытуацыя першая. «Пад ружжом» на агромністым бульбяным полі чалавек 150. З канца ў канец бульбянога мора сноўдае адна бульбакапалка (яшчэ тры недзе рамантуюцца). Надышоў момант, калі прыйшлося на градку ставіць па 16—18 чалавек! Гэта работа?!

Сытуацыя другая. Вязуць навучэнцаў двума аўтобусамі на калгаснае поле. Нечакана адзін сапсаваўся. Дык будзьце ласкавыя, садзіцеся ўсе разам у другі. Ні многа ні мала — нейкія 82 маладыя чалавечкі і 5 дарослых.

Сытуацыя трэцяя. Амаль 90 навучэнцаў экіпіраваныя вёдрамі, надвор'е — ня самае дрэннае, бульбы — насыпана, а на пагрузку двойчы заставаўся толькі адзін «МАЗ». Канечне ж, выстройваліся дзьве чаргі.

Сытуацыя чацьвертая. Раней прадстаўнікі сельгасарганізацый пільна сачылі за якасьцю ўборкі, катэгарычна забаранялі браць з сабой бульбу... Цяпер адна «наглядчыца» асабіста ўзьлезла на машыну з адборнай бульбай і пачала затарвацца на вачах маладых «шэфаў», паленавалася нават браць з градкі! Дарэчы, гэтая кабеціна, працуючы ў бухгальтэрыі, аказалася ня ў стане падлічыць правільна агульную колькасьць навучэнцаў пяці групаў.

Дзеля скарасьпелых рапартаў у некаторых гаспадарках могуць, абыходзячы баранаваньне-пераворваньне, пускаць былыя бульбяныя палеткі адразу «пад плуг» — адразу, маўляў, і ўгнаеньне будзе пад будучы ўраджай... Людзям пры гэтым бульбы сабраць не дадуць — у іх ня тая форма ўласнасьці...

Калі няма ў справе парадку, на авансцэне борзьдзенька разгортваюцца ў «баявыя парадкі» шчупальцы каманд-на-адміністрацыйнай сыстэмы. Вось, да прыкладу, у адной з установаў Маладэчна ў пятніцу 10 кастрычніка, пасьля абеду, работнікам паступіла дырэктыва начальства: у суботу (выходны дзень) — на бульбу! Дырэктыва, канечне ж, вусная, дырэктыва, канечне ж, з пагрозамі...

Выкладчыкі цяперака таксама сустракаюцца, бывае, надта ж «рэальныя». З аповеду навучэнцаў, некаторыя «сухамлінскія» ўмудраліся амаль не перасякаць рысы поля, дзе працавалі іхныя выхаванцы. Паўлегальны вываз бульбы — асобная тэма. Як глядзіш на асобных вёрткіх і нахабных уюноў-верхаводаў ад «пэдагагічнай нівы», слабым апраўданьнем могуць быць разважаньні тыпу: «Якім можа быць настаўнік, калі ён цяпер пастаўлены ніцма...»

Навучэнцы дружна «галасавалі» на найноўшыя «спэцыяльныя» ўмовы працы ліпавымі даведкамі і ўсялякімі дробнымі хітрыкамі-ўхіленьнямі: «А хто хоча быць батраком за 6 тыс. рублёў?». Моладзь усё бачыць і засвойвае... Ёсьць такая няўмольная псыхалягічная рэч — перанос. Гэта значыць — выкарыстаньне засвоеных стэрэатыпаў, шаблёнаў, схемаў у іншых сытуацыях (у далейшым). Перанос дзейнасьці з гэтай «карэлай рэчаіснасьці» на «чыстае палатно» свайго далейшага жыцьця. А падсьвядомасьць некалі ў суб'ектыўна падобных сытуацыях паслужліва «падсуне» з свайго запасьніку ўжо замацаваныя пляны дзеяньняў...

Дык дзе іх, навучэнцаў, віна, а дзе бяда?

**Сяргей Брадавы, Маладэчна**

## Вандалізмам з беспрасьветнасьці

**З кожным годам цывілізацыя ідзе наперад, павінна павышацца культура паводзінаў і маральнасьць маладога пакаленьня, але на кожным кроку назіраецца адваротнае.**

На маленькім масточку праз рачулку, па якім пераходзяць пэнсіянэры, каб скараціць шлях да крамы, сыстэматычна з году ў год выламваюцца парэнчы, расстаўленыя па беразе вадасховішча лаўкі абавязкова выкідваюцца ў ваду, вазы з кветкамі ўздоўж вуліцы разьбіваюцца, а сьметніцы зь сьмецьцем — перакульваюцца, псуюцца дарожныя знакі і нават шыльда ў кавярні, дзе маладзёны падмацоўваюцца ў час забаваў на дыскатэцы, аказваецца пабітай, і нікога не турбуе, што руйнуецца чалавечая праца, а ў гэты час дзесьці ў калгасах можа ісьці пад сьнег бульба і буракі і нікога гэта не бянтэжыць.

Я мяркую, што гэта ня толькі адрыжка мінулых савецкіх часоў, якіх моладзь ужо не застала, а ў значнай ступені палітыка чаркі і скваркі і адсутнасьць насьпелых у краіне рэформаў, што прывяло да застою і стагнацыі эканомікі і ў цэлым усяго грамадзтва.

Моладзь ня мае ясных і пэўных арыенціраў, і вандалізм зьяўляецца своеасаблівым пратэстам супраць галечы і беспрасьветнай будучыні.

Дарэчы, вельмі цікава тое, што моладзь ня б'е шыльдаў у прыватных крамах, не расьпісвае там сьцены непрыстойнасьцямі, не ламае каля тых крамаў дэкаратыўных дрэваў, бо ведае, што ўсё гэта чалавек зрабіў на свае грошы. Яны ведаюць гэтага чалавека і паважаюць яго за руплівасьць, у адрозьненьне ад стаўленьня да дзяржаўнай маёмасьці, дзе ўсё як бы нашае і адначасова — нічыё, якое нікому не належыць і якое можна зламаць, разьбіць, або скрасьці і прапіць...

Калі моладзь нічога ня мае за душой, ні маральнага, ні матэрыяльнага і не прадбачыцца аніякіх пэрспэктываў у будучыні, дык ніколі ня зьявіцца пачуцьцё гаспадара краіны, мястэчка, вуліцы, а ўрэшце любові да радзімы, якая нічога ня можа даць моладзі, акрамя чаркі і скваркі.

Крыўдна і сумна...

**Мікалай Куксо, Івянец**

# Язэп Драздовіч Галіны Горавай

«Касьмічны» мастак Язэп Драздовіч нават апасьля сьмерці робіць для нас адкрыцьці. На выставе «Нябесныя бегі» да 120-годзьдзя Драздовіча пабачыла я працы Галіны Горавай. Удзельніца Драздовіцкіх пленэраў, яна напісала партрэт мастака. Са спадарыняй Горавай, абаяльнай жанчынай у шляхетным капелюшы, мы гутарым пра «касьмічныя» сны Драздовіча, ягоны характар і карціны. «Для мяне Драздовіч — гэта нешта вельмі асабістае, — кажа спадарыня Горава. — Гэта заварожвае, гэта арыгінальны погляд на сьвет! Я проста адчула, што хачу напісаць ягоны партрэт пасьля шматлікіх пленэраў.

Кожная карціна Драздовіча заварожвае. Калі мы паглядзім на дыван, на рытм гэтых расьлінаў, то бачым, што ў іх руху ёсьць адчуваньне нейкай таямніцы, нейкай загадкі. Тут ёсьць гульня з прасторай, з колерам. Жывапіснай адукацыі Драздовіч не атрымаў. Калі з пункту гледжаньня жывапісу можна спрачацца — прафэсійна ці не, то графік ён цудоўны!»

— А што скажаце наконт ягоных «касьмічных» працаў?

— Ён апісваў свае касьмічныя вандроўкі ня як плён фантазіяў, а бачыў іх у сьне, наведваў у астральным целе. Мы ня можам цяпер гэта растлумачыць з навуковага гледзішча. Вядома, на іншых плянэтах ня бачылі такой архітэктуры, як на карцінах Драздовіча, але сам рэльеф Месяцу аказаўся вельмі падобным! Цяпер у нашай Акадэміі навук ляжаць ягоныя рукапісы, якія нават нідзе не друкаваліся. Вось «Нябесныя бегі» друкаваліся, але ў яго насамрэч даволі шмат твораў такой тэматыкі — пра ўтварэньне эфіру, пра жыцьцё на Вэнэры. Але гэта не навука, а філязофія, нейкія касмаганічныя тэзы, як зроблены наш космас, як створана нашая галяктыка.

— А які характар быў у Язэпа Драздовіча?

— Ён быў апантаны мастацтвам, апантаны спазнаньнем сьвету. І гэта дыктавала рысы характару: ён зусім ня дбаў пра сябе, ня меў сям'і, ня меў уласнага прытулку. Ён увесь час недаядаў, але ён пісаў, ён працаваў. Але цікава, што заўсёды Драздовіч быў такі шляхетны, арыстакратычны. Ніколі не хадзіў у брудных чаравіках, абавязкова капялюш, гальштук. Ніколі не апускаўся да вобразу валацугі. І ніхто ня бачыў, што ён галадае...

Я б параўнала яго зь Пірасмані — паводле гамы, і стылістыка таксама блізкая да народнай.

**Кацярына Бязмацерных**



ГАЛІНА ГОРАВА. «ЯЗЭП ДРАЗДОВІЧ»



**Фрагмэнт гравюры Эрыка Дальберга «Аблога Берасьця швэдамі ў 1657 г.».**

# Берасьце прыйдзе ў «крэпасьць–герой»

Пасьля вываду вайскоўцаў на тэрыторыі Берасьцейскай крэпасьці вызвалілася 300 гектараў зямлі — унікальны археалягічны і прыродны комплекс. Аблвыканкам усур'ёз думае пра аднаўленьне там гістарычнага цэнтру. Што з гэтага можа выйсьці? Піша Сяргей Харэўскі.

У Берасьцейскім аблвыканкаме абмеркавалі «канцэпцыю стварэньня гістарычна-культурнага цэнтру на тэрыторыі Берасьцейскае крэпасьці». Гэта стала магчымым з вывадам апошніх вайсковых структураў з тэрыторыі старое фартэцыі. Канцэпцыя прапануе аб'яднаць археалягічны комплекс старажытнага Берасьця, мэмарыял «крэпасьці-героя» і сучасны абласны цэнтар.

У 2019 г. горад над Бугам будзе сьвяткаваць 1000-годзьдзе. Разам з вывадам вайскоўцаў на тэрыторыі старасьвецкае крэпасьці вызвалілася ажно 300 гектараў зямлі — унікальны гістарычны, археалягічны і прыродны комплекс.

Па сутнасьці, побач з савецкім ваенным мэмарыялам «крэпасьці-героя» мусіць паўстаць новы турыстычна-забаўляльны цэнтар. Сярод іншага, усур'ёз разглядаецца магчымасьць рэстаўрацыі і рэгенэрацыі часткова ацалелых былых кляштараў бэрнардынак і бэрнардынцаў XVII ст… Абмяркоўваючы ідэю канцэпцыі, мэр гораду Аляксандар Палышэнкаў зазначыў, што гэтую тэрыторыю «вырашана не прадаваць па частках». А як прадаваць? І каму?

На паседжаньні каардынацыйнае рады праектныя распрацоўкі прадставіла праектна-будаўнічае прадпрыемства «Арміг», якім кіруе архітэктар М.Гайдуковіч. Найбольш інтэнсіўна плянуецца забудаваць Кобрынскае ўмацаваньне. Тут маюцца стварыць атракцыён а la «лінія Сталіна», замест састарэлага кемпінгу пабудаваць вялікі гатэльны комплекс, пад руіны колішняе Кобрынскае брамы працягнуць вуліцу Гогаля. Пры ўезьдзе ў крэпасьць пабудуюць вялікія аўтамабільныя паркінгі. Аўтары канцэпцыі прапануюць працягнуць у крэпасьць і чыгунку, каб катацца там на паравозах…

«Прадугледжана ўсё: кавярні і рэстараны, гатэлі, канфэрэнцзалі, выставачныя памяшканьні», — кажа М.Гайдуковіч. Не зважаючы ні на якія фінансавыя крызісы, аўтары праекту плянуюць пабудаваць тамака ж базу электрамабіляў, канатную дарогу, кола агляду, каб глядзець на Польшчу, то бок на НАТА і ЭС…

Валынскае ўмацаваньне займае плошчу 48 га, і менавіта тут пакуль зьберагаецца бальшыня помнікаў сярэднявечнага Берасьця. Тут захаваліся руіны каталіцкіх кляштараў, сярод якіх найбольшай цэласнасьцю вылучаецца ансамбль кляштараў бэрнардынак і бэрнардынцаў XVII ст., што некалі ўтваралі абрыс усяго гораду, з боку дарогі ва Ўкраіну. Ад іх засталіся часткова сьцены, а таксама падмуркі, сутарэньні, падземныя галерэі. Нам выдатна ведамы выгляд гэтага комплексу дзякуючы шматлікім красьлюнкам, абмерным рысункам, што рабіліся напярэдадні будаваньня крэпасьці. На руках у праектоўшчыкаў і гісторыкаў ёсьць уся дакумэнтальная база, каб аднавіць гэтую частку нашае спадчыны максымальна дакладна і абгрунтавана.

Але апроч таго тутсама праектоўшчыкі прапануюць пабудаваць макет сярэднявечнага Берасьця ў маштабе 1:5. На жаль, ідэя старая і зусім не арыгінальная. Макетамі нікога ня зьдзівіш, і відавочна, што гэта будзе выглядаць марнатраўствам на фоне рэальных помнікаў, якія можна рэстаўраваць. Тутсама, на Валынскім умацаваньні, фірма «Арміг» прапануе ўзнавіць каменна-драўляны замак з рамесным пасадам (?!), карчмою, млынам і броварам, каб разьмясьціць тут гатэльна-забаўляльны комплекс.

Чыя гэта будзе ўласнасьць — пытаньне спрэчнае. Бо ўлады і думкі не дапускаюць, што ў рэалізацыі праекту рэгенэрацыі старажытнага сярэднявечнага гораду возьмуць чынны ўдзел уласнымі сродкамі самі яго жыхары. Зрэшты, пакуль таму няма й законных падставаў.

Застаецца пытаньне і пра лёс цэнтральнага востраву, ці Цытадэлі, дзе ў свой час і былі найбольш важныя аб'екты берасьцейскае гісторыі: рынак з ратушай (падмуркі якое нядаўна выявілі), палац Сапегаў, першыя ў Беларусі і ў Вялікім Княстве друкарня, аптэка, манэтны двор, Вялікая сынагога, на ўзор якое, паводле рашэньня вааду 1628 г., трэба было ўзгадняць праекты сынагогаў ва ўсім ВКЛ. У руінах тут да нас дайшлі касьцёл сьвятога Казімера, кляштар эзуітаў, базыльянская царква сьвятых Пятра і Паўла, якую перабудавалі ў 1840 г. і назвалі «Белым палацам», дзе бальшавікі падпісалі мір зь Нямеччынай у 1918 г. (царква існавала да 1950 г., пасьля чаго была часткова разабраная, а ў 1972 г. яе аскабалкі былі закансэрваваныя). Што будзе з гэтымі аб'ектамі, побач зь якімі ўжо адбудавалі былы касьцёл аўгустынцаў XVII ст. пад праваслаўны сабор Сьвятога Мікалая? Пакуль няясна.

Каму мусяць належыць адноўленыя комплексы бэрнардынцаў? Што ў іх плянуюць разьмясьціць? Няясна і тое, як можна завяршыць за дзесяць гадоў раскопкі на тэрыторыі 300 га. Роўна ж няясною застаецца пэрспэктыва аховы і выкарыстаньня такой вялікай тэрыторыі, што, як магніт, цягне да сябе чорных археолягаў дый проста вандалаў. Бо досьвед Бабруйскае крэпасьці паказвае, што як толькі сышлі вайскоўцы, без належнае варты ўсё было разрабавана й панішчана.

Недахопы цяперашняй канцэпцыі, падрыхтаванай мясцовымі ўладамі кялейна і таемна, вынікаюць зь цьмяных уяўленьняў уладаў пра якасьць і характар Берасьцейскае спадчыны. Гэта й традыцыйны савецкі погляд на ролю дэкаратыўных руінаў «крэпасьці-героя», адмаўленьне права розных канфэсіяў валодаць месцамі колішніх храмаў, адмаўленьне магчымасьці аднаўленьня ня толькі паасобных аб'ектаў, але й суцэльнага гістарычнага асяродзьдзя…

Гэтаксама слабым бокам прапанаванай канцэпцыі ёсьць баланс экалягічных пэрспэктываў і забаўляльнай індустрыі. Тэрыторыя крэпасьці за пасляваенныя гады ператварылася і ва ўнікальны прыродны комплекс, дзе, напрыклад, існуе пакуль заказьнік «Барбастэла», што фінансуецца ААН. Гэтая калёнія кажаноў — адна з самых вялікіх у Эўропе. Для Берасьця і сьвету гэта куды важней, чым бэтонныя макеты ці колы агляду. Сёньня тут ці не адзінае ў горадзе месца ціхага і спакойнага адпачынку. Канцэпцыя не праходзіла экалягічнае экспэртызы. Наўмысна дапусьціць, каб у далейшым праектныя працы вяліся без эколягаў.

Практыка аднаўленьня гістарычных цэнтраў у Эўропе сьведчыць, што гэта працэс складаны і доўгі, які ня церпіць пасьпяшаньня, паказушнасьці. Калі на месцы ўнікальнага археалягічнага і прыроднага рэзэрвату ўзьнікне банальны гандлёва-забаўляльны цэнтар, гэта будзе калясальнаю стратаю ня толькі дзя Беларусі. Ведама ж, гатэлі, паркінгі, крамы — гэта важны і неад'емны элемэнт любога гораду. Але для іх ёсьць у Берасьці месца й па-за крэпасьцю. Для кола агляду то пэўна!

Але шанец пакуль ёсьць. Берасьце, можа быць, паўторыць подзьвігі Гданьску і Варшавы, падымецца, як той фэнікс, з хлуду «крэпасьці-героя», калі будуць папярэдне праведзеныя належным чынам археалягічныя, праектныя, будаўнічыя, прыродаахоўныя работы. І тады гэта будзе насамрэч цуд.

Эскізныя рашэньні праекту рэгенэрацыі асноўных гістарычна-культурных комплексаў павінныя быць распрацаваныя да 1 чэрвеня 2009 г. Час на зьдзяйсьненьне цуду ёсьць.



**Крэпасьць у Брэст-Літоўску ў 1840 г. на карціне Марціна Залескага.**

# Вацлаву Ластоўскаму — 125

Прэм'ер ураду БНР, творца першай «Нашай Нівы», акадэмік, адзін з бацькаў-заснавальнікаў Беларусі нарадзіўся 8 лістапада 1883 г. на Дзісеншчыне, у Падзьвіньні. Сёлета мы адзначаем 125-гадовы юбілей яго.



Вацлаў Ластоўскі у рэдакцыі «Нашай Нівы». Вільня, 1914 год.

# Загадка «Жыцьцяпісу» Ластоўскага

Піша Язэп Янушкевіч.

«Ранай майго жыцьця ёсьць нястача сыстэматычнай асьветы», — пісаў Вацлаў Ластоўскі ў дакумэнце, пра які тут пойдзе гаворка. На жаль, часам такую характарыстыку можна даць і дасьледчыкам ягонай спадчыны. Аднак усё па парадку.

Акурат на 120-годзьдзе Власта «Беларускі гістарычны часопіс» (2003, №3) выдрукаваў найкаштоўнейшы матэрыял: жыцьцяпіс В.Ластоўскага: (В.Зубко. «Curriculum vitae» Вацлава Ластоўскага і Тамаша Грыба).

Накінуўшыся на публікацыю зь непадробнай цікаўнасьцю, я смакаваў і шкадаваў, што не дацягнуўся да тых дакумэнтаў, калі пісаў свайго «Неадменнага сакратара Адраджэньня». Ці потым, складаючы том спадчыны Ластоўскага для выдавецтва «Беларускі Кнігазбор».

Той Curriculum vitae Ластоўскі складаў у 1925 годзе для дзеяча ўкраінскай эміграцыі Мікіты Шапавала, кіраўніка Ўкраінскага Сацыялягічнага інстытуту ў Празе, які прапанаваў Ластоўскаму стаць членам-карэспандэнтам. Дакумэнт па-свойму сэнсацыйны, бо ён... старыць Власта амаль на год. Калі б В.Зубко апублікавала яго раней і калі б не адшукалася ў 1990-я хросная мэтрыка Ластоўскага, мы мелі б іншую дату народзінаў Власта — 24 сьнежня 1882 г. І быў бы ён у нашым уяўленьні аднагодкам Купалы і Коласа. Жыцьцяпіс Ластоўскага, а таксама ягоны ліст да Шапавала, захаваліся ў Цэнтральным дзяржаўным архіве найвышэйшых органаў улады і кіраваньня Ўкраіны ў Кіеве, дзе знаходзіцца ўвесь праскі архіў украінскай эміграцыі.

Але вельмі хутка маё смакаваньне зьмянілася прыкрасьцю й гаркатою. Бо, вывучыўшы, наколькі было мажліва ў архівах Беларусі і Літвы, навуковыя фонды пра гісторыка, пісьменьніка, крытыка-публіцыста, аднаго з ідэолягаў беларускага руху, ня верылася, што Ластоўскі ў такім значным дакумэнце, як уласны жыцьцяпіс мог нарабіць гэтульківі памылак! Так, за плячыма ў Власта было 4 клясы пачатковай школкі, ён ня мог замест «*засьценку*» пісаць «*застценку*», замест «*зьбіты* з тропу» — «*зьбыты* з тропу».

Учытваючыся, заўважыў проста нейкую сыстэму памылак. Таму публікацыйная заўвага («увесь тэкст падаецца на мове арыгіналу») у мяне спарадзіла вялікі сумнеў. Каб разабрацца, належала дацягнуцца да арыгіналу, што і стала магчымым нядаўна не без спрыяньня ўкраінскага пасольства ў Беларусі, якую ачольвае найсымпатычнейшы пасол Ігар Ліхавы (былы міністар культуры ў сябе на радзіме).

І толькі пабачыўшы і вывучыўшы ўрэшце архіўныя матэрыялы, магу даць выйсьце эмоцыям, якія стрымліваліся не адзін месяц-год у чаканьні знаёмства. У маёй нябеднай археаграфічнай практыцы такое нядбальства сустрэў упершыню. Каб на 8500 публікацыйных сымбаляў-знакаў улупіць больш за 200 абдрукоўвак, памылак, няслушных скаротаў, пропускаў, уласнай фантазіі, нерасчытаных слоўцаў, якія пры мінімальным веданьні мовы лёгкачытэльныя (амаль пасьлядоўна ў В.Зубко ідзе блытаніна мяккага знаку «*ь*» і літары «*т*») — гэта ўжо занадта. Больш за тое — шкодна! Уявіце, калі такое пойдзе гуляць па сьвеце навуковым. Пэўна, не прабачае аўтарку і малады век (яна скончыла Віньніцкі дзяржунівэрсытэт у 1998 годзе).

Новую дату народзінаў Ластоўскага, 24 сьнежня 1882 г., пададзеную ў публікацыі, я спачатку таксама залічваў да памылак аўтаркі публікацыі. Аднак дзіва: так стаіць і ў арыгінале. Чаму Ластоўскі памыліўся? І ці памыліўся? Ці гэтая спроба састарыць сябе на год — адна зь містыфікацыяў Власта? Бо ў адшуканай у сярэдзіне 1990-х хроснай мэтрыцы пазначаныя дата нараджэньня — 8 лістапада (27 кастрычніка па старым стылі) 1883 г. і дата хросту — 26 сьнежня 1883 г. Цяжка адказаць. Чапляе іншае: у публікацыі сярэдзіны 2003 г. падаецца новая дата нараджэньня аднаго з найзначнейшых гістарычных дзеячоў XX стагодзьдзя — і ніхто з гісторыкаў на гэта не рэагуе. Кожны займаецца сваім, надрукаванае калегамі нікога не хвалюе.

Таму й прапаную паасобныя разьдзельчыкі з таго праска-кіеўскага архіву — трэба думаць, не дасьледаванага яшчэ як сьлед беларускімі гісторыкамі.

### Імя забароненае, а творы друкуюцца

Нават за савецкім часам, калі само імя Вацлава Ластоўскага нельга было станоўча згадваць у друку, ягоныя творы жылі сваім жыцьцём. Так, некалькі напісаных ім паданьняў, такіх як «Няпро і Сож», «Князь і ваявода», увайшлі пад выглядам народных у акадэмічны зборнік «Легенды і паданьні». Знаўца гісторыі нашаніўскага пэрыяду Сьцяпан Александровіч апублікаваў у 1970-я ў ЛіМе нататку пра выдадзеную ў 1913 г. у Пінску кніжачку «Прыгоды Тараса і Панаса» аўтарства нейкага Арцёма Музыкі. Ці ведаў ён, што гэта псэўданім Ластоўскага? І што гэты твор пад сапраўдным імем аўтара выходзіў у мюнхенскім выданьні ягоных твораў? Напэўна ж.

Ня выключана, што і песьня «Ой у нядзельку параненьку...» пра бітву пад Воршай належыць пяру геніяльнага стылізатара Ластоўскага. Але гэтага мы ўжо ніколі не дазнаемся.

Ластоўскі — геніяльны самавук, кажа гісторык Анатоль Сідарэвіч. Пачатковая школа, няскончаная гімназія (адлічаны за нездадзены экзамэн па расейскай мове) — вось і ўся адукацыя. А стварыў піянэрскую працу «Кароткая гісторыя Беларусі» (першую напісаную беларусам па-беларуску для беларусаў, як адзначаў прафэсар Анатоль Грыцкевіч). Ня кажучы пра «Гісторыю беларускай (крыўскай) кнігі», якая заслугоўвае высокай ацэнкі нават сучасных дасьледчыкаў. Яе прэзэнтуе, да прыкладу, прафэсар Яўген Неміроўскі ў першым томе сваёй «Истории славянского кирилловского книгопечатания», што выйшла ў Маскве ў 2003 г.

### Ластоўскі і Луцкевіч

Ва ўспамінах Вацлаў Ластоўскі піша, што рэдакцыя «НН» была падзеленая на дзьве палаты: верхнюю, у якую ўваходзілі браты Луцкевічы і Ўласаў, і ніжнюю, дзе працавалі Купала, Антон Лявіцкі, сам Ластоўскі. Камунікацыя між палатамі адбывалася шляхам прасоўваньня пад дзьверы тэкстаў для рэдактуры.

Ластоўскі і ня мог выклікаць даверу рэдактараў, — сьцьвярджае гісторык Анатоль Сідарэвіч. — Браты Луцкевічы, Уласаў былі ЦК Беларускай сацыялістычнай грамады. «Наша Ніва» на той час была штабам партыі і наагул беларускага руху. (Пакуль у 1913 г. не зьявілася газэта «Беларус» і не пачаў афармляцца хрысьціянска-дэмакратычны рух). Ластоўскі ж прыйшоў як чужы, як тэхнічны работнік на аклад народнага настаўніка — 25 рублёў.

Чаму Луцкевічы лічылі яго ідэйна чужым? Бо некалькі разоў мяняў партыйнасьць — спачатку быў у Польскай партыі сацыялістычнай, у нашаніўскі пэрыяд уступіў у Грамаду. Пазьней з сацыяліста зрабіўся нацыяналістам. (БСГ стаяла на пазыцыях «краёвага» патрыятызму, надаючы больш увагі сацыяльнаму вызваленьню для насельнікаў Беларусі ўсіх нацыянальнасьцяў). Ластоўскі меў намер разам з баронам Казімерам Шафнагелем і князем Вінцэнтам Сьвятаполк-Мірскім стварыць клерыкальна-кансэрватыўную партыю, а ў 1919-м нечакана для многіх стаў эсэрам.

### Ластоўскі-рэдактар

Нягледзячы на палемікі, канцэпцыя «Нашай Нівы» заставалася нязьменнай і выверанай, працягвае А.Унучак. Пры Ўласаве было хіба больш эканамічных матэрыялаў — ён сам жыва цікавіўся эканомікай; калі фактычным кіраўніком рэдакцыі быў Ластоўскі, больш увагі зьвярталася на літаратуру, фармаваньне нацыянальнай ідэі; на Купалаву долю прыпалі цэнзурныя белыя плямы, зьвязаныя з пачаткам вайны. Ідэйнае ж і стратэгічнае рэдагаваньне газэты цягам усяго яе існаваньня ажыцьцяўляў Антон Луцкевіч. Гэтаксама Луцкевіч, ды яшчэ Францішак Аляхновіч, пісалі перадавіцы ў газэце «Гоман», што выходзіла ад 1916 г. пад нямецкай акупацыяй і рэдактарам якой амаль паўтара году быў Ластоўскі. Дзіўны факт, зьвяртае ўвагу А.Сідарэвіч, за час рэдактарства ён не напісаў, бадай, ніводнага палітычнага артыкулу. Займаўся гісторыяй, бэлетрыстыкай.

# «Род наш выдаваў шмат містыкаў»

«Curriculum vitae» Вацлава Ластоўскага.

Радзіўся я ў засьценку Калесьніках на пагранічы Дзісенскага пав. (Віленск. губ.) і Лепельскага пав. (Віцеб. губ.) з бацькі Юстына, сына Юзафата і маткі Ганны з дому Жвірблеўскай, у 1882 годзе 24 XII. Хрышчоны у Задарожжы, 20 X 1883 г. па Рыма–Каталіцкаму абраду.

Бацькі мае былі беззямельнымі хлебаробамі, і, як у нас кажуць «хадзілі па арэндзе», г. зн. што другі–трэцьці год перекачовывалі на новую арэндную сялібу, пераносячыся няраз з аднаго ў другі, суседні павет.

У сям'і ў нас былі уніяцкія традыцыі і немаль да 1905 году ўвесь наш род судзіўся за апорнасьць у уніяцтве. Род наш выдаваў шмат містыкаў.

Праўдападобна у зьвязку зь містычным настроем вялося, што у нашым родзе, з бацькі на сына, з пакаленьня ў пакаленьня, займаліся лечаньнем; з гэтай прычыны мы ў Дзісеншчыне больш ведамы пад прыдомкам «Дактаронкі».

Сямья наша ў сваім акружаньні слыла інтэлігентамі, бо бацька мой праходзіў павятовую школу, шмат падарожнічаў па сьвеце і ў моладасьці быў 10 гадоў практыкантам у доктара, але скончыўшы практыку і атрымаўшы пасведчаньне на права лячэньня, практыкай не займаўся.

Згодно гэтым сямейным традыцыям, пасьля акончаньня мной народнай школы, бацька паслаў мяне да свайго брата, Францішa Ластоўскага, вучыцца лекарскага ўмецтва, які распачаў маю адукацыю ад навукі лаціны. Лекцыі адбываліся практычна: мы ішлі ў поле і на кветках вучыў мяне дзядзька найперш лацінскай назовы колераў кветак, лічэньня, пасьля лацінскія імёны самых расьцін і адначасна тлумачыў якая расьціна на якое недамаганьне памочна, як і калі яе зьбіраць, пераховываць і прыгатаўляць да ужытку. Вучыўся я ў дзядзькі усяго адно лета: у восень таго году бацька мой зламаў руку, і мая помач патрэбна была дома.

У 1896 гаду, калі сямья наша, дзякуючы хваробе бацькі, дайшла да найвышэйшага недастатку, я надумаў шукаць сабе працы і, прайшоўшы 70 вёрст пяхатой да чугункі, выехаў у Вільню...

У 1906 гаду я быў арэштаваны за сацыялістычную пропаганду, і сядзеў некалькі месяцаў у турме...

У 1909 гаду 25.III. пераехаў у Вільню, куды быў запрошаны А.Уласавым «вясьці фактычна» часопіс «Наша Ніва», дзе пад тытулам сакрэтара Рэдакцыі працаваў да 1915 году.

У 1913 годзе сарганізаваў я «Беларускую кнігарню ў Вільні» (Завальная, 7), якую вёў да 1918 году...

Будучы фактычным рэдактарам «Нашай Нівы», я з 1909 году ня меў часу працаваць навукова, бо трэба было продукаваць тое, што вымагаў круг чытачоў і маладое беларускае адраджэньне. Пісаў я ў гэтым часе вельмі многа; няраз запаўняючы цэлыя нумары ад пачатку ад канца, пад рожнымі псэўдонімамі і акром гэтага вядучы яшчэ месячнік сельскай гаспадаркі «Саху», укладаючы што году популярныя у той час календары «Нашай Нівы».


28–1925 г.

Curriculum vitae
В. Ластоўскага.

Радзіўся я ў засьценку Калесьніках на пагранічы Дзісенскага пав. (Віленск. губ.) і Лепельскага пав. (Віцеб. губ.) з бацькі Юстына, сына Юзефата і маткі Анны з дому Жвірблеўскай, у 1882 годзе 24. XII. Хрышчоны у Задарожжы, 20. X. 1883 г. на Р.-К. абраду.

Бацькі мае былі беззямельнымі хлебаробамі, і, як у нас кажуць „хадзілі па арэндзе" г. зн. што другі-трэцьці год перакачовывалі на новую арэндную сялібу, пераносячыся нераз з аднаго ў другі, суседні павет.

У сямі у нас былі уніяцкія традыцыі і немаль да 1905 году ўвесь наш род судзіўся за апорнасьць у уніяцтве. Род наш выдаваў шмат містыкаў.

Праўдападобна у звязку з містычным настроем вялося, што ў нашым родзе, з бацькі на сына, з пакаленьня ў пакаленьне, займаліся лечаньнем; з гэтай прычыны мы ў Дзісеншчыне больш ведамы пад прыдомкам „Дактаронкі".

Сямья наша ў сваім акружаньні сыла інтэлігентамі, бо бацька мой праходзіў павятовую школу, шмат падарожнічаў па сьвеце, і ў моладасьці быў 10 гадоў практыкантам у доктара, але скончыўшы практыку і атрымаўшы пасьведчаньне на права лячэньня, практыкай не займаўся.

**Першая старонка «Curriculum vitae» Ластоўскага. Друкуецца ўпершыню.**

### Ластоўскі і «краёўства»

Ластоўскі палемізуе на старонках «НН» з былымі аднапартыйцамі. Вядомы ягоны ліст да Антона Луцкевіча, у якім Ластоўскі рэзка выступае супраць Уласава, вінавацячы яго ў «лібэральнасьці да краёвай ідэалёгіі» (маецца на ўвазе напісаны ў 1912 г. праграмны артыкул Уласава з канцэпцыяй «краю пяці нацыяў»). Ластоўскі заклікае «абапірацца на фанатыкаў сьвятой справы» нацыянальнага адраджэньня.

Канцэпцыя «краёўства», прынятая БСГ, вырасла з сыстэмы арганічнай працы, якую стварыла мясцовая эліта пасьля паразы паўстаньня 1863 г., — кажа гісторык Андрэй Унучак. — Падставовым прынцыпам тае сыстэмы быў прынцып легальнасьці. Пад выглядам сельскагаспадарчых таварыстваў, правядзеньня сельгасвыставаў Вайніловіч, Скірмунты стваралі сыстэму ўплыву, мясцовага самакіраваньня, незалежную ад царскіх чыноўнікаў. Культывавалі незалежную ад расейскай дзяржавы актыўнасьць.

І Луцкевічы, і Ўласаў былі таксама носьбітамі гэтай ідэі. Паглядзіце — і «НН» выступае за земствы, самакіраваньне. Выступае за стварэньне сеткі народных школаў — гэта другі важны пункт. «НН» распаўсюджваецца праз тую самую сетку агентаў, што і шматлікія польскія газэты. Празь сетку, якая стваралася дзесяцігодзьдзямі. Дзеля пашырэньня ўплыву дзеячы БСГ ствараюць — побач з «Нашай Нівай» — газэты на польскай (Kurjer Krajowy) і расейскай («Вечерняя Газета») мовах.

Пазьней, у лютым 1918 году, Ластоўскі адзін галасуе на паседжаньні Беларускай Рады супраць стварэньня Беларуска–літоўскай дзяржавы — на «краёвых» падставах.

Да падзелу рэдакцыі, як яго апісвае Ластоўскі, А.Унучак ставіцца скептычна: «Быў падзел невідочны, падзел у выхаваньні, адукацыйным узроўні. Луцкевічы і Ўласаў, былі носьбітамі арыстакратычнай традыцыі, Ластоўскі ж быў самавук, няхай і геніяльны, Купала таксама ў вялікай меры. Купала ў лістах зьвяртаецца да Луцкевіча «паночак». Гэта было натуральна. І якраз Луцкевічы, Уласаў імкнуліся загладзіць гэтую прорву. Знаходзілі работнікам жытло, працу, магчымасьць вучыцца, уводзілі «ў сьвет». Нават той факт, што Ластоўскі быў у масонскай ложы, якую на ўсерасейскім узроўні прадстаўляў А.Луцкевіч, — хто іншы яго мог туды запрасіць? Хіба гэта ня сьведчаньне ўмоўнасьці падзелаў?

### Ластоўскі-масон

Што такое было масонства — «масанэрыя», як казалі ў Вільні, у пачатку XX стагодзьдзя? Наднацыянальная арганізацыя, што яднала прагрэсіўных людзей, якія ставілі сваёй мэтай зьвяржэньне самаўладзтва. Віленскую масонскую ложу на агульнарасейскіх зьездах прадстаўляў Антон Луцкевіч, кажа Анатоль Сідарэвіч. І сустракаўся там, да прыкладу, зь Міхайлам Грушэўскім, Аляксандрам Керанскім. Але нацыянальнае і сацыяльнае заўжды бярэ верх. У 1917 годзе адбыўся момант ісьціны. І былыя масоны, калі паўстала патрэба будаваць нацыянальныя дзяржавы, сталі па розных баках барыкадаў.

### Ластоўскі-прэм'ер

Даўнія ідэалягічныя і палітычныя супярэчнасьці з А.Луцкевічам прычыніўся да таго, што ў сьнежні 1919 году Ластоўскі даў згоду стаць «сьцягам» перавароту ў Радзе БНР, сплянаванага Крачэўскім і Захаркам. Яны вінавацяць А.Луцкевіча ў «палянафільскай палітыцы» за пастаянныя сустрэчы з Падэрэўскім і Пілсудзкім. Яны лічаць, што варта распачаць перамовы з бальшавікамі. А «палянафіл» Луцкевіч у той час інтэрнаваны палякамі і знаходзіцца пад фактычным арыштам у варшаўскім гатэлі. Ён, Луцкевіч, ведае, што Ластоўскі, Крачэўскі і Захарка сталі на фальшывы шлях, бо старшыня Саўнаркаму УССР Хрысьціян Ракоўскі адназначна сказаў яму, што саветы не прызнаюць БНР, нават калі БНР прыме савецкую канстытуцыю. Луцкевіч шукаў ключы ад беларускага пытаньня ў Парыжы, Бэрліне і Варшаве. Стаўленьне Захаду выказаў адзін з гаспадароў тагачаснага сьвету, Жорж Клемансо, ударыўшы па мапе на тым месцы, дзе месьціцца Беларусь, і прамовіўшы: "Тут будзе Расея!" Заставалася надзея на Пілсудзкага, які пэўны час быў схільны будаваць новую Рэч Паспалітую на фэдэратыўных прынцыпах. Прызнала б БНР Польшча – прызнаў бы і Захад.

Прэм'ерства Ластоўскага было адзначана і падтрымкай антыпольскай беларускай партызанкі, і нотай пра прызнаньне права Літвы на Віленскі край, уручанай ім у 1922 г. старшыні Генуэскай канфэрэнцыі. За гэта Антон Луцкевіч пісьмова называе Ластоўскага «бандытам». Навошта Ластоўскі гэта зрабіў? Мо разьлічваў здабыць падтрымку ад літоўцаў на дзейнасьць партызанкі, ны культурныя праекты. Ягоная «Гісторыя беларускай (крыўскай) кнігі» выйдзе ў Літве.

**СМ**

### Сярод апошніх згадак пра Ластоўскага ў пэрыядычным друку БССР

Пасьля вяртаньня ў БССР у 1927 г. Вацлаў Ластоўскі працаваў у Беларускім дзяржаўным музэі. Ён тады сур'ёзна паглыбіўся ў фальклорна–этнаграфічныя дасьледаваньні. Часопіс «Полымя» (№10 за 1928 г.) паведамляў: «Этнаграфічная экспэдыцыя ад катэдры этнаграфіі Інбелкульту і Белдзяржмузэю вяла сёлета досьледы ў кірунку Слуцак—Мазыр праз Паўстынь, Галь, Любань, Азарычы, Даманавічы, Асташковічы, Славяны. На чале экспедыцыі стаяў кіраўнік катэдры этнаграфіі Інбелкульту тав.Ластоўскі. Экспэдыцыя сабрала вельмі каштоўныя экспанаты беларускай народнай разьбы па дрэве ў ліку 70 штук, беларуска–мастацкага ткацтва да 500 штук экзэмпляраў...

Апроч таго, экспэдыцыя сабрала 100 штук тканых паясоў, прычым кожны пояс ёсьць асобная адмена ўзору. Усе здабытыя экспанаты пераданы ў Белдзяржмузэй».

У тым самым годзе «Полымя» (№5) пад рубрыкай «Хроніка беларускай культуры» паведамляе: «Дырэктар БДТ т.Ластоўскі набыў у Слуцку вельмі каштоўную гістарычную рэч — парцэляную парфумэрніцу, зробленую ў Сэўры (Францыя) па заказу жонкі Напалеона Жазэфіны. Трэба меркаваць, што парфумэрніца завезена ў Слуцак у часе паходу Наполеона ў 1812 г.»

Сапраўднай «лебядзінай песьняй» Ластоўскага–фальклярыста можна назваць яго выступ на Ўсебеларускай канфэрэнцыі ў 1929 г., шырока тыражаваны ў СМІ. Праз год, падчас экспэдыцыі ў Сібір, ён будзе арыштаваны.

**Ігар Карашчанка**

# 90 гадоў ад Вялікай вайны

У аўторак у Вялікабрытаніі, Францыі і Бэльгіі прайшлі мерапрыемствы, прысьвечаныя 90-годзьдзю падпісаньня Камп'енскага міру, які паклаў канец Першай сусьветнай вайне.

Першую сусьветную на Захадзе называюць Вялікай вайной. Яна доўжылася больш за 4 гады: з 28 ліпеня 1914 г. да 11 лістапада 1918 г. 28 ліпеня 1914 г. Аўстра-Вугоршчына абвясьціла вайну Сэрбіі, 1 жніўня — Нямеччына Расеі, а 2 жніўня Нямеччына заняла Люксэмбург.

У выніку баявых дзеяньняў і наступстваў вайны загінула і памерла каля 10 млн чалавек, было паранена 20 млн, яшчэ 10 млн памерла ад голаду і эпідэмій.

У вайну былі ўцягнутыя 38 дзяржаваў з агульнай колькасьцю насельніцтва ў 1,5 млрд. чалавек.

У Бэльгіі яны пачаліся ў панядзелак, пад Іпрам. Там у лістападзе 1914 г. брытанскія, французскія і бэльгійскія войскі трымалі абарону цягам велізарных ахвяраў, а ў красавіку 1915 г. немцамі быў упершыню ў гісторыі прыменены нэрвова-паралітычны газ, які цяпер усе называюць іпрытам.

У Лёндане ўрачыстая цырымонія пройдзе ля мэмарыялу Кенатаф на Ўайтхоле.

У Францыі ўрачыстасьці пройдуць на былой лініі фронту ля Вэрдэну, дзе сукупныя страты двух бакоў склалі 300 тыс. чалавек. У гэтых урачыстасьцях возьме ўдзел Нікаля Сарказі.

Францускія гісторыкі цьвердзяць, зазначае Euronews, што французам ня выстаяць было б у вэрдэнскай мясарубцы, каб не Нарачанская апэрацыя расейскай арміі ў Беларусі, якая адцягнула на сябе частку нямецкіх сілаў.

Для Беларусі вайна таксама мела велізарныя наступствы.

Край у выніку нямецкай акупацыі быў падзелены на дзьве часткі: па лініі Дзьвінск (Даўгаўпілс)—Паставы—Смаргонь—Баранавічы—Пінск.

Наступ нямецкага войска ў 1915 г. зрушыў у «бежанства» (прымусовую эвакуацыю) 1,3 млн чалавек, было зьнішчана 65% прадпрыемстваў.

Вайна спрычынілася да падзеньня Дому Раманавых, Кастрычніцкай рэвалюцыі, абвяшчэньня незалежнасьці БНР, нарэшце стварэньня БССР.

У Нацыянальнай Акадэміі навук у сераду пачалася навуковая канфэрэнцыя, прысьвечаная Першай сусьветнай вайне. А за дзень да гэтага, паведамляе Інтэрфакс, у Баранавіцкім раёне з нагоды заканчэньня «царскай вайны» прайшлі ўрачыстыя мерапрыемствы — у выглядзе імпрэзы з удзелам аматараў гісторыі ў форме нямецкага, аўстра-вугорскага і расейскага войскаў. Таксама адбылася цырымонія адкрыцьця Памятнага каменю ў памяць усіх загінулых падчас Першай сусьветнай на тэрыторыі Беларусі.

**АГ**



**Беларусы на Першай сусьветнай вайне.**


**Помнік нямецкім салдатам Першай сусьветнай ля вёскі Памошша ў Мядзельскім раёне.**

# Апошні герой Першай сусьветнай

Генры Ўільяму Олінгхэму 112 гадоў. Ён глухі, сьляпы і рухаецца ў інвалідным вазку. Ён — найстарэйшы мужчына ў Эўропе і адзін з трох жывых брытанскіх вэтэранаў Першай сусьветнай вайны.

У 2004 годзе, калі адзначалася 90-годзьдзе яе пачатку, іх было 23.

У Злучаным Каралеўстве Першую сусьветную называюць проста Вялікай вайной. У народнай памяці яна займае нашмат больш значнае месца, чым Другая сусьветная. У 1939—1945 гадах краіна страціла 393 740 чалавек (разам зь мірнымі жыхарамі і маракамі), у 1914—1918 — 811 410 чалавек. 1 662 625 брытанцаў былі паранены.

Таму Дзень вэтэранаў, калі ўшаноўваюць памяць усіх загінулых ва ўсіх войнах, што вяла Вялікая Брытанія, прымеркаваны да 11 лістапада —дню Камп'енскага перамір'я, што паклала канец Першай сусьветнай вайне.

У аўторак гэтай падзеі споўнілася 90 гадоў.

Як заўсёды, вакол Кенатафу — манумэнту на Ўайтхоле ў Лёндане — узьнікае дыван з чырвоных макаў. У цырымоніі возьмуць удзел каралева Элізабэт II і тры брытанскія вэтэраны, якія засталіся жывымі —110-гадовы пехацінец Гары Пэтч, 108-гадовы марак Ўільям Стоўн і авіятар Генры Олінгхэм.

Напярэдадні сьвята Олінгхэм зьявіўся на публіцы. Ён удзельнічаў у адкрыцьці выставы аэраплянаў часоў Першай сусьветнай вайны ў Музэі Каралеўскіх ВПС і даў невялікае інтэрвію тэлекампаніі ІРТN.

Олінгхэм служыў авіямэханікам у марской авіяцыі, у 1916 г. пілятаваў гідраплан-выведнік падчас знакамітага Ютляндзкага бою, а потым накіраваўся ў Францыю, дзе яму давялося ўдзельнічаць у наземных баях падчас бітвы на Соме.

Там Олінгхэм наглядзеўся такіх жахаў, што ўсё жыцьцё гнаў ад сябе ўспаміны пра вайну.

«Я скочыў уніз і упаў на бэтон. У мяне проста пацямнела ўваччу. Ну, вы ведаеце, як гэта бывае. Праз нейкі час я ачомаўся, устаў і пайшоў некуды ўправа. Я прайшоў зусім няшмат, мне здалося, усяго некалькі крокаў, і апынуўся ў вадзе. Яна даходзіла мне да плячэй. Я трапіў у варонку. У ёй было поўна мёртвых людзей, запоўнена да краёў. І Бог ведае, што яшчэ там было, але яно варушылася», — апавядаў ён.

Толькі апынуўшыся адным з апошніх відавочцаў Вялікай вайны, Олінгхэм пагадзіўся надыктаваць на магнітафон свае ўспаміны, якія былі выдадзеныя ў выглядзе кнігі пад назвай «Апошні добраахвотнік Кітчэнэра» [брытанскі фэльдмаршал, ваенны міністар падчас Першай сусьветнай вайны].

«Вельмі важна тое, што яны [удзельнікі Першай сусьветнай вайны] ня будуць забытыя. І кожны адчувае да іх вялікую ўдзячнасьць. І ніхто ня можа быць празьмерна ўдзячным за тое, што гэтыя людзі зрабілі для яго», — з намаганьнем выгаворваючы словы, сказаў ён карэспандэнту.

**Бі-Бі-Сі**


**Генры Олінгхэм згадвае баявых таварышаў.**

**Сусьветная бойня**

Паводле афіцыйных зьвестак, у Першай сусьветнай вайне загінула 9 996 769 вайскоўцаў і 6 702 387 цывільных асобаў. Самыя вялікія страты панесла Расейская імпэрыя — 2 311 000 чалавек. Колькасьць мабілізаваных перавысіла 71 млн. чалавек.

Сёньня ў сьвеце засталася 10 удзельнікаў Вялікай вайны — па трое ў Аўстраліі, Брытаніі і ЗША і адзін ва Ўкраіне.

Найстарэйшы зь іх — Генры Олінгхэм, малодшы — 104-гадовы амэрыканец Ўільям Олін.

Адзінаму вэтэрану Першай сусьветнай вайны ў былым СССР, жыхару Данецку Міхаілу Яфімавічу Крычэўскаму, 111 гадоў.

У кастрычніку 1917 году ён скончыў паскораны курс Кіеўскай ваенна-інжынернай вучэльні, атрымаў званьне прапаршчыка і быў накіраваны на Галіцыйскі фронт, але ў сувязі зь вядомымі падзеямі прыняць удзел у баях не пасьпеў.




## ІМПРЭЗЫ

**Генадзь Бураўкін**

**17 лістапада на сядзібе ТБМ (вул. Румянцава, 13)** — сустрэча з паэтам Генадзем Бураўкіным «Беларуская літаратура ў сваім часе». **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

**Зьбігнеў Гербэрт па-беларуску**

**22 лістапада ў Акадэміі мастацтваў (тэатар-студыя Я.Міровіча (пр. Незалежнасьці, 81, другі паверх))** адбудзецца вечарына польскай і беларускай паэзіі «Рэканструкцыя паэта». У межах імпрэзы: творы клясыка XX ст. Зьбігнева Гербэрта па-польску і па-беларуску; вершы Ўладзімера Арлова, Веры Бурлак, Алеся Разанава, Андрэя Хадановіча ў арыгінале і ў польскіх перакладах; прэзэнтацыя спэцыяльнага нумару часопіса «ARCHE», прысьвечанага Зьбігневу Гербэрту; прэзэнтацыя дзьвюх кніг З.Гербэрта «Рэканструкцыя паэта» і «Спроба апісаньня»; прэзэнтацыя дзьвюхмоўнай анталёгіі беларускай паэзіі «Nie chyliłem czoła przed mocą». Вядзе імпрэзу Андрэй Хадановіч. **Пачатак а 18-й.** Уваход вольны.

## ВЫСТАВЫ

**Графіка Анджэя Канечнага**

**У Музэі сучаснага выяўленчага мастацтва (пр.Незалежнасьці, 47) да 30 лістапада** працуе выстава графікі Анджэя Канечнага (Гдыня, Польшча) «Пастэлі».

**Фота Алена Флешара**

**У галерэі «ЛаСандрарт» з 18 да 21 лістапада** працуе выстава фотаздымкаў Алена Флешэра «Рамка і адлюстраваньне». **Адкрыцьцё 18 лістапада ў 18.30. 20 лістапада** адбудзецца сустрэча франкафоннай публікі з Аленам Флешарам **у абласной бібліятэцы імя Пушкіна (Гікалы, 4). Пачатак у 18.30.**

**Франкафонныя комiксы**

**У абласной бібліятэцы імя Пушкіна да 20 лістапада** працуе выстава афішаў «Франкафонныя коміксы адзначаюць сваё стагодзьдзе». Яна складаецца з 35 ілюстрацыяў з калекцыяў Міжнароднага цэнтру коміксаў і малюнкаў Ангулему.

**Графіка Яўгена Шатохіна ў Нью-Ёрку**

**16 лістапада ў 12.30 у Беларускім музэі (401 Atlantyk Ave., Brooklyn, N.Y)** — адкрыцьцё выставы графіка Яўгена Шатохіна «Мая і твая Беларусь». На выставе гледачы ўбачаць краявіды Палесься, Віцебшчыны, выявы жыхароў Паазер'я.

## КАНЦЭРТЫ

**Neuro Dubel**

**14 лістапада ў DAclub (П.Броўкі, 22)** — канцэрт Neuro Dubel. **Пачатак а 19-й.**

**Вольскі ў «Графіці»**

**18 лістапада ў «Графіці» (зав.Калініна, 16)** — прэзэнтацыя сольнага праекту «Куплеты і прыпевы». **Пачатак а 20-й.**

**Крама ў «Рэактары»**

**21 лістапада ў «Рэактары» (Харужай, 29)** — вялікі сольны канцэрт Крамы. **Пачатак а 19-й.**

**Грыфаманія-2008**

**22—23 лістапада ў ДК МТЗ (Даўгабродзкая, 24)** — X Міжнародны фэстываль гітарыстаў «Грыфаманія-2008». **Пачатак а 19-й.** Квіткі: 15000 — 25000

**«P.L.A.N.» і «Крок»**

**18 лістапада ў «Bronx» (пр. Машэрава, 17/1)** выступяць «P.L.A.N.» і «Крок». **Пачатак а 21-й.** Квіткі: 10000.

## СПЭКТАКЛІ

**Купалаўскі тэатар**

**14 (пт)** — «Я не пакіну цябе...»
**15 (сб)** — «Івона, прынцэса Бургундзкая»
**16 (ндз)** — «Чычыкаў»
**17 (пн)** — «Каханьне ў стылі барока»
**19 (ср), 20 (чц)** — «Чорная панна Нясьвіжу»
**21 (пт)** — «Сымон-музыка»
**22 (сб)** — «Вольга»
**23 (ндз)** — «Ідылія»
*малая сцэна*
**14 (пт)** — «Маці»
**17 (пн)** — «Адчыніце кантралёру!»
**19 (ср)** — «Баляда пра каханьне»

## КІНАПАКАЗ

**Лістападзік і швэдзкае кіно**

У рамках дзіцячага кінафэстывалю «Лістападзік» жыхары і госьці Менску могуць убачыць два дзіцячыя швэдзкія фільмы: **«Тое асаблівае лета Кіда Свэнска», (19 лістапада, к-р «Піянэр», пачатак у 14.30)** і анімацыйны фільм **«Лабан — маленькі прывід» (16 лістапада, «Дом кіно», пачатак а 11-й).**

## КІНО НА ВЫХОДНЫЯ

# «Квант міласэрнасьці»

**Квант міласэрнасьці**
(Quantum of Solace)

ЗША — Вялікабрытанія, 2008, каляровы, 106 хв.

**Рэжысэр:** Марк Форстэр

**Ролі выконваюць:** Дэніэл Крэйг, Вольга Курыленка, Мацье Амальрык, Джудзі Дэнч, Джанкарла Джаніні

**Жанр:** баявік

**Адзнака:** 6 (з 10)

Джэймз Бонд (Дэніэл Крэйг) палюе за міжнародным нягоднікам Дамінікам Грынам (Мэцью Амальрык), які плянуе пераварот у Балівіі. Пры гэтым супэрагент выходзіць з-пад кантролю спэцслужбаў і стаецца чалавекам, апантаным прагай асабістай помсты. Ці знойдзецца ў душы цыніка-забойцы квант міласэрнасьці?

Аднаўлены Бонд Дэніэла Крэйга надалей зьнішчае традыцыі бандыяны. Ягоны агент, які быў недасьведчаным і нават слабым у «Казіно «Рояль», цяпер жорсткі цынік, які страціў усялякія рысы былой чалавечнасьці дый з канвульсіўным холадам забівае кожнага й усіх. А звыклы глямур ня здольны схаваць духоўнай спустошанасьці й брыдоты.

Рэжысёр Марк Форстэр, які зьняў рэалістычна-горкую драму «Баль пачвараў» і натхнёную «Чароўную краіну», знайшоў для свайго героя балючыя жэсты і ледзяныя фразы. Так, Джэймз Бонд па-ранейшаму носіцца на аўто, гучаць выбухі, а бойкі галавакрутныя (і галавaломныя).

Але хто сказаў, што забойства на замову дзяржавы — гэта шпегаўская рамантыка? Што ламаць насы добра, а катаваць ворагаў дзеля высокіх мэтаў — хораша? Гэта брыдка, гнюсна й страшна — як выкінуць цела найлепшага сябра ў памыйніцу (бедны Джанкарла Джаніні!)

Джэймз Бонд Марка Форстэра — гэта ўжо не герой, а машына забойства. «Джэймз, спыніцеся! Джэймз, вы забілі яго!» — крычыць кіраўнічка Бонда міс М. (Джудзі Дэнч). Але машына ахопленая цягучай, як нафта, прагаю помсты. І нават традыцыйная дзяўчына Бонда (украінка Вольга Курыленка) яму ня ў радасьць.

У новай бандыяне — і новыя міжнародныя акцэнты. Цяпер пагроза ідзе ад двудушных экалягічных арганізацыяў, якія прысабечылі галоўны заўтрашні рэсурс — пітную ваду. Нягоднікі мусяць быць пакараныя.

Але для асабістага ворага — хоць бы квант міласэрнасьці.

**Андрэй Расінскі**

МЫ САМІ

# Кніга пра «Нашу Ніву»

Выйшла з друку першае гістарычнае дасьледаваньне, прысьвечанае «Нашай Ніве» пачатку XX стагодзьдзя.



ЮЛІЯ ДАРАШКЕВІЧ

Кніга «Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915)» пабачыла сьвет у выдавецтве «Беларуская навука». Яе аўтар — супрацоўнік Інстытуту гісторыі Акадэміі Навук, кандыдат гістарычных навук Андрэй Унучак. «Дасьледаваньне прысьвечанае гісторыі рэдакцыі «Нашай Нівы», гісторыі выданьня «Нашай Нівы» і віленскаму беларускаму асяродку, які ажыцьцяўляў выданьне і распрацоўваў асноўныя моманты нацыянальнай ідэі, — кажа А.Унучак. — Тут прааналізаваная публіцыстыка газэты, створаная пэрыядызацыя станаўленьня нашаніўскай рэдакцыі, адлюстраваная таксама праграма эканамічных рэформаў, якую ачольвалі нашаніўцы. Асаблівая заслуга тут належыць Аляксанру Ўласаву.

Таксама прасочваецца сувязь сацыялізму з нацыянальнай ідэяй на старонках «Нашай Нівы» і ўвогуле ў тагачасным беларускім руху. І, натуральна, уплыў «Нашай Нівы» на фармаваньне нацыянальнай ідэі. Чаму менавіта «НН» мела такі фэнамэнальны ўплыў, не зважаючы на яе рэсурсы. Тры тысячы асобнікаў сярэдні наклад — у той час, як толькі польскіх газэтаў у Вільні тады выходзіла 28 назваў, расейскіх безьліч, летувіскія газэты выходзілі. Падтрымка дзяржавы, падтрымка царквы, землеўласьнікаў — усе сілы яны мелі. А «Наша Ніва» з такім мінімальным рэсурсам мела такі істотны посьпех. Я спрабую прааналізаваць, чаму. Чаму «Наша Ніва» адбылася», — кажа гісторык.

**СМ**

**«Наша Ніва» і беларускі нацыянальны рух (1906—1915)** — Менск: «Беларуская навука», 2008

# Вашу дзярэўню трэба перайменаваць

Тацяна Барысік. Запісы.

* * *

— Вашу дзярэўню трэба перайменаваць у Гадзюкіна, — кпіць зь мясцовых разлаваная дачніца.

— І хто ж ета нам тут нагадзіў? — не здаюцца апанэнты на лаўцы.

* * *

— Будзьце ласкавыя, дайце мне рэцэпт каньяку.

— Якога?

— Што з самагону робіцца.

* * *

Сталы аматар піва прачытаў у газэце артыкул аб шкодзе гэтага напою і ні на грам не засмуціўся:

— Вось тут напісана — піва з арганізму і кальцый і магній выводзіць. Ну й няхай сабе! Нашто мне ўсё гэта.

* * *

У адну раку нельга ўвайсьці двойчы, — цытуе вядоўца тэлепраграмы старажытнага філёзафа.

— А чаму? — абураецца тэлеглядач. — Бярэзіна была, Бярэзіна і ёсьць.


## ПРЫВАТНЫЯ АБВЕСТКІ

**БЕЛАРУСКАЕ ВЯСЕЛЬЛЕ**

**Правядзем** беларускае вясельле з элемэнтамі традыцыйнага абраду, народнымі танцамі і дудой. Т.: (029) 704–00–18

**СЯБРОЎСКІЯ ПАДАРОЖЖЫ**

**Запрашаем у падарожжа** 23 лістапада (нядзеля) па маршруце: Менск—Беніца—Крэва—Баруны—Гальшаны—Вішнева—Дзясятнікі—Валожын—Менск

**28 лістапада** — 1 сьнежня: Львоў—Луцк—Уладзімер-Валынскі—Зімнэ. Т.: (029) 622–57–20, (029) 509–12–16, (029) 110–19–28; Zmikas1@tut.by

**КНІГІ**

**Адам Станкевіч** «Выбранае» — 44-я кніга праекту «Беларускі кнігазбор» ужо ў кнігарнях і ў распаўсюднікаў

**Антон Луцкевіч**. «Выбраныя творы» — апошнія экзэмпляры ў Акадэмічнай кнізе


## «НН» СТО ГАДОЎ З ВАМІ

**У Думе і каля Думы**

Правіцельства хоча, каб Дума зацьвердзіла закон, каб маладыя людзі, каторыя знаходзяцца пад сьледствам за палітычныя справы, адбывалі ваенную службу толькі тады, як сьледства і суд над імі скончыцца. Левая часть Думы не хацела зацьвердзіць гэтага закону, але правых больш, і закон Дума зацьвердзіла.

**«Наша Ніва», № 24 ад 3 лістапада 1908**

# Ня ўсё ў жыцьці апошні раз

**Каб штотыдзень атрымліваць газэту,**

дасылайце адрасы і грошы за газэту. Кошт на месяц — 12 тыс. рублёў.

1) Просім усіх ахвотных чытаць газэту **паведамляць у Рэдакцыю свае адрасы і тэлефоны. Гэта можна зрабіць праз** тэлефоны: (017) 284-73-29, (029) 260-78-32, (029) 618-54-84, e-mail: dastauka@nn.by, паштовы адрас: 220050, г.Менск, а/с 537.

2) **Просім у бланку банкаўскага паведамленьня ці паштовага перакazу дакладна і разборліва пазначаць адрас, у тым ліку паштовы індэкс і код пад'езду.**

ПАВЕДАМЛЕНЬНЕ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір

КВІТАНЦЫЯ

ПВУП "Суродзічы", УНП 190 786 828
МГД ААТ "Белінвестбанк", вул. Калектарная, 11, Менск, код 764

Рахунак атрымальніка: 3012 206 280 014 | Асабовы рахунак:

(прозьвішча, імя, імя па бацьку, адрас)

| Від аплаты | | | | Дата | Сума |
|---|---|---|---|---|---|
| За газэту "Наша Ніва" | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | | |
| | | | | Агулам | |

Касір М.П.

## Дзякуй

**Міхаілу Т.** з Слуцкага раёну.
**М.Я.** з Смалявіцкага раёну.
**Анатолю Б.** з Магілёва.
**Міхаілу К.** з Рэчыцкага раёну.
**Леакадзіі Н., Вінцэнту С.** з Валожынскага раёну.
**Валянціне А.** з Талачынскага раёну.
**Л.П., Леаніду А.** з Маладэчанскага раёну.
**Уладзімеру Ц.** з Лагойскага раёну.
**Інэсе В., А.К., П.Х.** з Аршанскага раёну.
**Ігару Л.** з Стаўпецкага раёну.
**Валер'ю С., Яну Дз., А.Ц., А.Л.** зь Віцебску.


**Наша Ніва**
незалежная газэта

заснаваная ў 1906, адноўленая ў 1991

**галоўныя рэдактары «Нашай Нівы»:**
З.Вольскі (1906), А.Уласаў (1906—1914), Янка Купала (1914—1915), А.Луцкевіч, У.Знамяроўскі (1920), С.Дубавец (1991—2000).

сакратарка рэдакцыі — Наста Бакшанская
шэф-рэдактар — Андрэй Дынько
галоўны рэдактар — Андрэй Скурко
мастацкі рэдактар — Сяргей Харэўскі
заснавальнік — Мясцовы фонд выданьня газэты «Наша Ніва»
выдавец — Прыватнае прадпрыемства «Суродзічы»

**АДРАС ДЛЯ ДОПІСАЎ:**
**220050, Менск, а/с 537**
**Tel/fax: (017) 284-73-29, 8-029-613-32-32, 8-029-707-73-29.**
**E-mail: nn@nn.by**
**On-line: www.nn.by**


© **НАША НІВА**. Спасылка на «Нашу Ніву» абавязковая.

12 палос фарматам А2, 6 друк. арк. Друкарня РУП «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». Менск, пр. Ф.Скарыны, 79. Рэдакцыя не нясе адказнасьці за зьмест рэклямных абвестак. Кошт свабодны. Пасьведчаньне аб рэгістрацыі пэрыядычнага выданьня №581 ад 14 сакавіка 2007 г., выдадзенае Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Юрыдычны адрас: 220101, г. Менск, пр. Ракасоўскага, 102–71. Р/р 301220628014 у МГД ААТ «Белінвестбанк», Менск, код 764.

Наклад 2239. Газэта выдаецца 48 разоў на год.
Нумар падпісаны ў друк 23.00 12.11.2008.
Замова № 6259.
Рэдакцыйны адрас: Ракасоўскага, 102–71.